ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 19 (1138) | Серада, 6 сакавіка 1957 года | Цана 40 кап.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

1—2-я старонкі

УСЕСАЮЗНЫ З'ЕЗД СОВЕЦКІХ МАСТАКОЎ. **За далейшы росквіт совецкай мастацкай творчасці** — прамова Сакратара Цэнтральнага Камітэта КПСС тав. Д. Т. Шэпілава.

3-я старонка

Ан. Ус — Ілюстрацыі да кнігі.

Пісьменнік і чытач. П. Верабей — Слабыя вершы.

А. Вялюгін — Ці заўсёды чытач мае рацыю?

Ф. Лейтман — Вобразы нашых сучасніц.

4-я старонка

І. Жыновіч — На канцэрце Рускага народнага аркестра.

ЭНТУЗІЯСТЫ КУЛЬТУРНАЙ РАБОТЫ. **Н. Васілеўскі** — Яе паважаюць калгаснікі. **А. Верамейчык** — Сёстры Флёркавы.

З ЗАМЕЖНАЙ ПОШТЫ.

УСЕСАЮЗНЫ З'ЕЗД СОВЕЦКІХ МАСТАКОЎ

За далейшы росквіт совецкай мастацкай творчасці

Прамова Сакратара Цэнтральнага Камітэта КПСС тав. Д. Т. ШЭПІЛАВА

Таварышы! Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Совецкага Саюза звярнуўся да Усесаюзнага з'езда мастакоў з прывітаннем, у якім, ацаніўшы вялікі ўклад совецкіх майстроў выяўленчага мастацтва ў агульнанародную справу будаўніцтва камуністычнага грамадства ў нашай краіне, паставіў перад імі вялікія творчыя задачы. Прывітанне Цэнтральнага Камітэта—гэта ідэйная праграма дзеянняў для совецкіх мастакоў.

У сувязі з гэтым дазвольце выказаць некаторыя меркаванні.

Мастацтва новага жыцця

Першы Усесаюзны з'езд мастакоў сабраўся ў знаменальную дату — у год сарокагоддзя Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай революцыі, якая адкрыла новую эру ў гісторыі чалавецтва — эру крушэння капіталізма і ўсталявання новага, социялістычнага грамадства.

Кастрычніцкая социялістычная революцыя, ажыццёўленая пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі на чале з вялікім Леніным, узняла да свядомай гістарычнай творчасці народныя масы, правяўшыя цуды гераізма ў будаўніцтве новага жыцця. Натуральна, што да 40-годдзя Совецкай улады працоўныя нашай краіны з пачуццём гордасці падводзяць вынікі сваёй работы і выначаюць планы на будучае ва ўсіх галінах грамадскага жыцця. Такія вынікі і перспектывы ў сферы выяўленчага мастацтва абмяркоўвае і ваш з'езд.

Напярэдадні сарокагоддзя совецкім мастакам не сорамна глядзець у вочы свайму народу: яны сумленна папрацавалі і многа зрабілі для яго. Наш жывапіс, графіку, скульптуру, наша прыкладное і дэкаратыўнае мастацтва ведаюць і цэняць далёка за межамі Радзімы. Калі-б сабраць у якую-небудзь грандыёзную галерэю ўсё лепшае, што створана совецкімі мастакамі за гэтыя сорак год і цяпер каштоўнымі россыпямі распаўсюджана па сотнях карцінных галерэй, музеяў, палацаў культуры, то атрымалася-б цудоўная выстаўка, якую можна было-б назваць «Мастацтва новага жыцця». **(Апладысменты).**

Гэтая выстаўка была-б сведчаннем вялікай натхняючай сілы социялізма, які апладатварае сваімі жыватворнымі сокамі прагрэс ва ўсіх галінах гаспадарчага жыцця, у навуковай творчасці, у літаратуры і мастацтве. Гэтая выстаўка паказала-б, што выяўленчае мастацтва нашай краіны стала магутным многагранным мастацтвам новага ідэйнага зместу, мастацтвам велізарнай мастацкай сілы.

Усіх сваіх поспехаў наша мастацтва змагло дасягнуць таму, што яго жывіла сваім багатым і шматгранным зместам жыццё народа: праца і барацьба совецкіх людзей паказвалі тэмы і вобразы. Шчасце для мастацтва, што жыватворны кастрычніцкі вецер разагнаў і развеяў туман дэкадэнтшчыны, эстэцтва, адарванага ад жыцця фармалізму. Мы сустракаліся і потым з тлятворнымі ўплывамі гэтых плыней. Але галоўнае і вызначаючае заключаецца ў тым, што мастацтва наша развівалася як праўдзівае, рэалістычнае мастацтва, якое ўходзіць сваімі коранямі ў таўшчыню народнага жыцця.

Галоўнае пытанне, якое пранізвала ўсю перадз'ездаўскую дыскусію, ставілася ў выступленнях у друку і на розных сходах, а цяпер знаходзіцца ў цэнтры ўвагі з'езда,—гэта пытанне аб **напрамку** развіцця совецкага выяўленчага мастацтва. Совецкую грамадскасць не можа не хваляваць, па **якім шляху** будзе ісці далей наша мастацтва.

У капіталістычным свеце ёсць нямала прагрэсіўных мастакоў, рэалістаў, якія жадаюць служыць свайму народу, тварыць у імя социяльнага прагрэсу, мастакоў, што самаддана імкнуцца за мір, за дэмакратыю, за свабоду і незалежнасць народаў. Адняк буржуазны друк, мастацтвазнаўства, долары і франкі падтрымліваюць фармалістычны напрамак у мастацтве, якое заклікана ядам нігілізма і нігілізацыя на ўсе святыні культуры разбэшчваць душы людзей, ідэйна падрыхтоўваць усякіх ганьбавальнікаў і пагромшчыкаў. Вернасць жыццю, праўдзівасць вобразаў, служэнне высокім ідэалам трубадуры гэтага мастацтва лічаць чымсьці «старамодным» і «адсталым». Каму не вядома, што палотны сучасных экспрэсіяністаў, «абстракцыяністаў» і іншае робяць самае цяжкае ўражанне поўнага распаду зместу, формы, інтэлекта наогул.

За апошнія два гады нам давялося некалькі разоў пабываць у Францыі. Французкая, краіна вялікіх революцыйных традыцый, вялікіх духоўных скарбаў, краіна, якая мае выдатны рабочы клас, кіруемы праслаўленай, сапраўды марксісцкай, партыяй комуністаў, краіна з шырокім слоем прагрэсіўнай, дэмакратычнай інтэлігенцыі, якія любяць свой народ, сваю радзіму. У адзін з прыездаў мне выпала магчымасць паглядзець у Парыжы выстаўку мастакоў 16 еўрапейскіх краін, якая называлася выстаўкай «неарэалізма», хоць у ёй не было ні грана рэалізма. Мы пераходзілі з залы ў залу і на сотнях палотнаў бачылі нейкія брудныя, гніласныя плямы, ненатуральнае спалучэнне гарызантальных і вертыкальных ліній, кубаў і шароў, паталагічнае нагрувашчванне колераў і фарбаў. Ні адно палатно не дазваляла нават прыблізна здагадацца аб сэнсе і змесце напісанага.

Мы палыйшлі да палотнаў, якія належалі пэндзлю суправаджаўшага нас віцэ-прэзідэнта выстаўкі. Я звярнуўся да яго з пытаннем, ці не можа ён сказаць, які змест гэтых палотнаў, якую тэму або якія пачуцці хацеў ён адлюстраваць на выстаўленых карцінах. Ён адказаў: «Гэта проста фарбы. Фарбы і лініі. Сапраўднае мастацтва не можа мець ніякага зместу. Першае палатно называецца «Эманацыя», другое — «Опус № 9». **(Ажыўленне ў зале, смех).** Калі-б якое-небудзь палатно мела пэўны змест,—сказаў ён,—то мы не прынялі-б яго на выстаўку. Жывапіс, як і музыка, не павінен мець ніякага зместу. Хіба сімфоніі Бетховена або Чайкоўскага маюць які-небудзь змест?» — заклаў ён мне пытанне.

Я папрабаваў растлумачыць, якімі ідэямі і пачуццямі ўзбагацілі чалавецтва на стагоддзі, напрыклад, Трэцяя сімфонія Бетховена — гераічная або Шостая сімфонія Чайкоўскага — патэтычная, што «Рэквіем» Моцарта не проста выпадковае спалучэнне гукаў, а геніяльнае развіццё вялікай гуманістычнай тэмы. Якія глыбокія па зместу і бліскуча прыгожыя па форме творы Глінкі, Мусаргскага, Баха, Шапена, Ліста і іншых тытанаў музычнай творчасці. А якое багацце зместу заключаюць у сабе карціны найвялікшых майстроў выяўленчага мастацтва! У іх адлюстравана жыццё народа ва ўсёй яго рознастайнасці, паказана аблічча людзей, іх пачуцці і імкненні. Мы поўныя бязмежнай удзячнасці да найвялікшых мастакоў Мікеланджэло і Леанардо да Вінчы да Рэпіна, Сурыкава, Перова, Левітана, Серова, мы поўныя ўдзячнасці нашым сучасникам жывапісцам, у карцінах якіх заключана жыццёвае багацце, увасоблены глыбокія пачуцці, вялікія ідэалы. **(Апладысменты).** І калі пэўныя колы заходніх мастакоў становяцца на шлях абстракцыяністкіх пачварнасцей і выпустошвання з мастацтва яго зместу, яны адмаўляюцца ад жыцця, ад чалавека, ад вялікіх ідэалаў.

Цяжкае, прыгнятаючае ўражанне ад парыжскай выстаўкі яшчэ больш узмацнілася таму, што толькі за некалькі дзён да азнаямлення з ёю мы з пачуццём бязмежнага захаплення аглядалі найвялікшыя творэнні архітэктараў і скульптараў у Барнаку, у старажытнай сталіцы Егіпта—Фівах, непаўторны архітэктурны ансамбль Геліаполіс (цяпер Баальбека) у Ліване. У Рыме мы з захапленнем разглядалі роспісы Рафаэля і Сікстынскую капелу з неўміручымі фрэскамі Мікеланджэло, галерэю Баргезе, а таксама іншыя музеі, у якіх сабраны шэдэўры антычнай скульптуры і жывапісу эпохі Адраджэння, якія здзіўляюць страснасцю пачуцця, глыбінёй думкі мастака, творы, што дагэтуль да нас жывы подых мінулых эпох.

У Афінах мы адчулі вечную чароўнасць непаўторных помнікаў антычнага свету. У Парыжы, у Луўры, мы бачылі «Венеру Мілоскую», «Рабоў» Мікеланджэло, палотны Леанардо да Вінчы, Рафаэля, Рэмбрандта, Давіда, Міле, Дэлакруа і іншых вялікіх майстроў — творы, якія адзначаны пячаткай генія, праніжнуты мудрай яснасцю і гарачай любоўю да чалавека.

І вось пасля ўсяго гэтага мы пачулі словы віцэ-прэзідэнта парыжскай выстаўкі «неарэалізма»: «Рафаэля цяпер ніхто-б не купіў, будуць купляць нашы палотны. Увесь жывапіс да неарэалізма — гэта расфарбаваныя малюначкі. Наша выстаўка — гэта сапраўды Рэнесанс, гэта новая эпоха». **(Смех).**

У заключэнне віцэ-прэзідэнт запрасіў нас у апошнюю залу, у якой мы ўбачылі на сцяне дзіўнае збудаванне. На фанерный дошцы было ўстаноўлена нейкае кола, да яго на вяроўках былі прымацаваны кансервавыя бляшанкі, расфарбаваныя ў розныя колеры. Побач з колам быў прымацаван вярчальны трохвугольнік з наклеенымі папяровымі палоскамі розных колераў. Пасля ўключэння электрычнага току кола з кансервавымі бляшанкамі пачало круціцца, бляшанкі брынчалі і бразгалі, палоскі паперы шамацелі і выгіналіся вакол бляшанак. Калі мы спыталі віцэ-прэзідэнта, што ўсё гэта азначае, ён адказаў: «Няўжо вы не разумееце, гэта спалучэнне колеру і гуку. Гэта проста геніяльна». **(Смех).**

Усё бачанае здавалася нейкай паталагічнай недарачнасцю, здзекам з чалавечых пачуццяў і ўяўленняў. Адзіным суцяшэннем было тое, што за наша амаль трохгадзіннае знаходжанне ў залах выстаўкі «неарэалізма» мы сустрэлі ўсяго двух наведвальнікаў. **(Смех. Апладысменты).**

Социялістычнае грамадства ўвасабляе сабой вясну чалавецтва, яно з'яўляецца носьбітам і прыхільнікам сапраўднай цывілізацыі і прагрэсу. Таму совецкім людзям чужыя ўсякага роду паталогія ад эстэтыкі, фармалістычна-дэкаэнцкія пачварнасці, якія паднесяцца пад флагам наватарства. Ленін гаварыў аб буржуазным ілжэнаватарстве, якое адмаўляецца ад прыгожага і разбурае мастацтва: «Чаму трэба схіляцца перад новым, як перад богам, якому трэба пакарыцца толькі таму, што «гэта новае»? Бяссэнсіца, суцэльная бяссэнсіца! Тут многа крывадушнасці і, вядома, несвядомага ніжапаклонства перад мастацкай модай, якая пануе на Захадзе. Мы добрыя революцыянеры, але мы адчуваем сябе чамусьці абавязанымі дажазаць, што мы таксама стаім «на вышыні сучаснай культуры»... Я не магу лічыць творы экспрэсіянізма, футурызма, кубізма і іншых «ізмаў» вышэйшым праяўленнем мастацкага генія. Я іх не разумею. Я не адчуваю ад іх ніякай радасці». (Клара Цэткін, Успаміны аб Леніне, стар. 13).

Вызначаючы мастацкія задачы, мы зыходзім з таго, што наша социялістычнае грамадства, не бачанае яшчэ ў гісторыі чалавецтва, з'яўляецца **наватарскім,** непрымірымым да рутыны па самой сваёй прыродзе. Мы звязваем мастацтва з барацьбой народа, яго духоўным развіццём і ўсебаковым культурным ростам, з яго вялікімі перспектывамі.

Социялістычнае грамадства адкрывае сапраўды неабсяжныя гарызонты развіцця мастацтва. Зместам мастацтва становяцца велізарнага размаху працэсы народнага жыцця, барацьба новага са старым, вялікія революцыйныя пераўтварэнні на карысць народа і звязаны з гэтым рост асобы. Задача мастацтва заключаецца ў тым, каб эстэтычна выхоўваць мільённыя масы працоўных, узбагачаць іх свядомасць, служыць магутнай зброяй духоўнага росту і культурнага развіцця. **Нам патрэбны не фармалістычныя крыўлянні, не пачварныя параджэнні «абстракцыяністаў», а мастацтва глыбокай жыццёвай праўды, высокай чалавечнасці, прасякнутае перадавой думкай і сагрэтае цеплынёй чалавечага сэрца. (Бурныя апладысменты).**

Калі разглядаць з'явы ў вялікім гістарычным маштабе, то на долю мастакоў нашай краіны выпала асабліва ганаровая місія—быць апорай рэалізма ў выяўленчым мастацтве, даваць адпор эстэцкім шаленствам, адстойваць і развіваць лепшыя мастацкія традыцыі. Совецкія жывапісцы, скульптары, графікі павінны ствараць творы такога мастацкага ўзроўню, каб яны паказалі ўсім вялікія перавагі рэалізма і тым самым заваёўвалі ўсё новых і новых прыхільнікаў рэалістычнага напрамку сярод мастакоў усіх краін. Адстойваючы прынцыпы рэалізма, мы тым самым не толькі накіроўваем наша выяўленчае мастацтва па адзіна правільнаму шляху, але і падтрымліваем прагрэсіўныя сілы, што імкнуцца да рэалізма ў зарубежных краінах, а тым сумленным, але заблуджаючымся мастакам, якія захоплены фармалістычным патокам, дапамагаем вырвацца з яго мутных струменяў.

Социялістычны рэалізм і творчая індывідуальнасць мастака

Нашы дзеячы мастацтва за совецкія гады прайшлі вялікі шлях развіцця. Дастаткова параўнаць нават лепшыя палотны, створаныя ў першыя гады революцыі, з творамі апошніх год, каб стала ясна, што совецкае выяўленчае мастацтва не стаіць на месцы, а ідзе ўперад, набыло новыя і новыя каштоўнасці, якія ўваходзяць у залаты фонд мастацкай культуры краіны социялізма.

Сувязь мастацтва з жыццём, народнасць мастацтва, беззаветнае служэнне мастака новаму грамадскаму ладу—гэта вялікія і высокародныя пачаткі, асноватворныя для мастацтва. Гэта і ёсць фундамент для сапраўднага, самага смелага наватарства ў мастацкай творчасці. І найбольш значнымі творамі совецкага мастацтва мы называем творы, у якіх—ці ідзе гутарка аб карцінах Грэкава ці партрэтах Несцерава, палотнах Бродскага або Кукрыніксаў (М. Купрыянаў, П. Крылоў, Н. Сакалоў), скульптурах Шадра або манументах Мухінай—з вялікай мастацкай сілай адлюстраван гістарычны шлях новага, социялістычнага грамадства, аблічча совецкага чалавека, барацьбіта і будаўніка.

За апошні час мы сустракаліся з вострымі нападкамі на совецкае мастацтва. Калі гаварыць аб злосных выпадах супраць нашага рэалістычнага мастацтва, ячэя ідуць з імперыялістычнага лагера, то трэба заўважыць, што гэтыя выпады робяць гонар совецкім мастакам, таму што паказваюць, што наша мастацтва стаіць на правільным шляху і іменна таму выклікае злосную раз'юшанасць ворага. **(Апладысменты).** Нападкі гэтыя, зразумела, не выпадковыя. На нашых вачах рэзка абвастраецца барацьба агрэсіўных імперыялістычных колаў супраць лагера міру і социялізма. Падзеі ў Егіпце і ў Венгрыі паказалі некаторым бесклапотным людзям, што суіснаванне і жанамічнае спаборніцтва социялізма з капіталізмам не ёсць мірнае ідыліччнае быццё. Суіснаванне не выключае, а прадугледжвае барацьбу. Праўда, гэтая барацьба не вядзе за сабой фатальнай неміну часці вайны, але ў некаторых галінах, і перш за ўсё на фронце ідэалагічным, яна часам даходзіць да вельмі вострых форм.

Мы разумеем, што ворагі социялізма, крытыкуючы совецкую скульптуру, жывапіс або літаратуру, нападаюць, вядома, на революцыйную ідэалогію ў цэлым, на марксісцкі светапогляд, на асновы нашай палітыкі. І наш абавязак—смела і рашуча адказваць на ўсе варожыя напаўкі, выкрываючы і саромячы ідэйных праціўнікаў, бо совецкае мастацтва ўвасабляе самыя перадавыя ідэалы, самыя перадавыя тэнденцыі развіцця мастацкай творчасці.

Унутры краіны, сярод некаторай (праўда, невялікай) часткі работнікаў мастацтва мы часам сустракаемся з неразуменнем, з неўразуменнымі пытаннямі, а зрэдку і з прамой крытыкай непахісных прынцыпаў совецкага мастацтва. Наш абавязак —дапамагчы такім дзеячам мастацтва правільна разабрацца ў неўразуменных пытаннях, растлумачваць тое, што няясна. Ад кожнага з нас патрабуецца дакладнасць ідэйных пазіцый, цвёрдасць і прынцыповасць. Але іменна таму трэба ўмець пераконваць, аргументаваць, адстойваць свае погляды на аснове аналізу канкрэтных з'яў і агульных тэнденцый развіцця мастацтва, а не зводзіць справу да лаянкі і наклейвання ярлыкоў. **(Апладысменты).**

У асяроддзі мастакоў грунтоўна крытыкаваўся рад дрэнных карцін, схематычных, пабудаваных па абстрактнай рацэптуры, пазбаўленых жыццёвай праўды, вобразнай выразнасці. Крытыкуюць фальшывую, пампезную, лакіровачную прадукцыю. Крытыкуюць творы, у якіх сапраўднае мастацтва падменена ўбогім натуралістычным капіраваннем, роўнадушным рамесніцкім фотаграфізмам, у якіх няма ні думкі, ні запалу, ні прыгажосці.

Гэтая крытыка ў асноўным справядлівая. У такіх творах аўтары парываюць з праўдай жыцця, з высокімі патрабаваннямі мастацтва, з социялістычным рэалізмам. За гэта яны і крытыкуюцца з боку мастацкай грамадскасці. Аднак некаторыя таварышы робяць зусім нечаканы вывад—прычынай такіх недахопаў нашага мастацтва яны аб'яўляюць... метад социялістычнага рэалізма. Але-ж кожнаму непрадузятаму чалавеку ясна, што прычыны паяўлення слабых работ—не следаванне метаду социялістычнага рэалізма, а, наадварот, адыход ад яго. **(Апладысменты).**

Тая акалічнасць, што дрэнныя творы, аб якіх я гаварыў, выдаваліся сім-тым за творы рэалізма, ды яшчэ да таго-ж социялістычнага, толькі перашкаджала барацьбе за социялістычны рэалізм, ускладняла і рабіла цяжкай барацьбу супраць эстэцка-фармалістычных элементаў. **(Апладысменты).** Але-ж нам трэба бачыць сутнасць рэчаў. Супраць кожнай вялікай ідэі або прынцыпу праціўнікі заўсёды прабавалі выкарыстоўваць любыя недахопы іхажыццяўлення. Але хіба гэта павінна перашкаджаць адстойваць правільную ідэю або прынцып, адмаўляцца ад ажыццяўлення іх?!

Метад социялістычнага рэалізма, які з'яўляецца творчым метадам совецкага мастацтва, патрабуе праўдзівага, гістарычна канкрэтнага адлюстравання рэчаіснасці ў яе революцыйным развіцці, дапамагае мастаку пранікаць у сутнасць жыццёвых з'яў, раскрываць іх заканамернасць, бачыць за павярхоўнасцю глыбінныя працэсы і перспектывы руху ўперад.

Мастак не фатограф. Фотаапарат пасіўна адлюстроўвае тое, што знаходзіцца перад ім. Мастак-жа заклікан—і гэта самае галоўнае ў творчасці — скрозь вонкавае бачыць карэнны змест жыцця, **сутнасць** з'яў.

Само паняцце социялістычнага рэалізма глыбока і ясна адлюстроўвае сутнасць і своеасаблівасць совецкага мастацтва, як новай ступені, новага кроку ў мастацкім развіцці чалавецтва. У ім выяўлена арганічная сувязь нашага мастацтва з лепшымі рэалістычнымі традыцыямі мінулага, бо іменна рэалізм даў свету творы вялікіх ідэй і непараўнальнай мастацкай прыгажосці. Але рэалізм совецкага мастацтва—гэта не паўтарэнне, не капіраванне рэалізма мінулага. Гэта рэалізм, гэта творчы метад, апладнены самым перадавым і адзіна навуковым светапоглядам сучаснасці—марксізмам-ленінізмам, які вырас і развіваецца на глебе найвялікшай революцыі, адкрыўшай новую эру ў гісторыі чалавечага грамадства.

Самая галоўная і самая каштоўная рыса метаду социялістычнага рэалізма заключаецца ў тым, што гэты метад няўхільна накіроўвае ўвагу мастака да жыцця, да людзей, да нашай рэчаіснасці ў яе развіцці, у барацьбе новага са старым, ва ўсёй яе складанасці і шматграннасці. Гэты метад патрабуе глыбокага разумення працэсаў, якія адбываюцца ў жыцці, ён абавязвае мастака быць у сваёй творчасці не проста сведкай, а ўдзельнікам барацьбы народа за перамогу прынцыпаў новага грамадскага ладу, патрабуе высокага майстэрства, усебаковага ўдасканалення тэхнікі.

Зразумела, што рысы мастацтва социялістычнага рэалізма трэба шукаць не ў расфарбаваных фатаграфіях, не ў без густу пышных палотнах, а ў такіх жыццёва праўдзівых карцінах, як, напрыклад, «На старым уральскім заводзе» і «Допыт комуністаў» Іягансона, «Тачанка» Грэкава, «Ленін на трыбуне» і партрэты дзеячоў культуры А. Герасімава, «Хадакі ў Леніна» Серова, «Маці партызана» С. Герасімава, «Калгасны ток» Пластова, не ў стылізавана-халодных манументах, а ў «Ленініяне» Андрэева, у «Рабочым і калгасніцы» Мухінай, у скульптурах Шадра, Томскага, у помніку воіну-вызваліцелю Вучэціча, у графіцы Г. Верэйскага і многіх іншых. Творчы метад совецкага мастацтва адлюстраван у творах праўдзівых, сардэчных, блізкіх совецкаму чалавеку.

Нашы праціўнікі гавораць, што метад социялістычнага рэалізма нібыта навязвае мастаку якіясьці низменныя, застылыя догмы і схемы. Што грахі таіць, і ў нас ёсць крытыкі ад мастацтва, якія выказваюць ісціны э такім выглядам, нібыта ўсе складанейшыя праблемы і запаветныя тайны мастацкай творчасці схаваны ў іх у камізэлькавай кішэні. **(Апладысменты).** Само сабой зразумела, што было-б няправільна меркаваць аб сутнасці социялістычнага рэалізма па домыслах некаторых сектантаў і групаўшчыкоў.

Вызначаючы асноўныя рысы социялістычнага рэалізма, як творчага метаду совецкага мастацтва, партыя падкрэслівае недапушчальнасць такога вытлумачэння гэтага метаду, якое пацягнула-б за сабой **нівеліроўку** мастацкіх індывідуальнасцей майстроў мастацтва. Недарэчна патрабаваць, каб усе тэатры краіны былі падобны толькі на МХАТ, а ўсе мастакі працавалі толькі ў манеры перадвіжнікаў, хоць усе мы цэнім вялікія заслугі і неўвядальнае значэнне і МХАТа і перадвіжнікаў.

Калі ствараласа Акадэмія мастацтваў, у першы склад членаў акадэміі, які зацвярджаўся ўрадам, былі ўключаны мастакі **розных творчых індывідуальнасцей.** Тым самым падкрэслівалася недапушчальнасць якой-бы там ні было нівеліроўкі і уніфікацыі. Нажаль, кіраўніцтва Акадэміі мастацтваў, асабліва за апошнія гады, праяўляла пэўную вузкасць і абмежаванасць у падыходзе да асноўных праблем мастацкай творчасці. Творы невялікай групы мастакоў часта аб'яўляліся адзіным выяўленнем сапраўднага социялістычнага рэалізма, а на людзей з іншым мастацкім почыркам глядзелі часам недаверліва і падазрона. **(Апладысменты).**

Социялістычны рэалізм не сумяшчальны ні з якай вузкасцю і дагматызмам. Нельга прынцыповасць падмяняць групавой прадузятасцю, нельга лёгка «адлучаць» ад социялістычнага рэалізма і залічаць тых або іншых майстроў у катэгорыю «эстэтаў-фармалістаў» або, наадварот, «натуралістаў-фатаграфістаў», уяўляючы социялістычны рэалізм як нейкае пракрустава ложа і старанна падстрыгаючы ўсё, што не падыходзіць да загадзя выбранай меркі. **(Апладысменты).**

Калі тая ці іншая група, падтрымліваемая пэўнымі крытыкамі, шумліва выступае супраць «іншадумных» і пры гэтым заяўляе, што яна і толькі яна прадстаўляе партыйны пункт гледжання і социялістычны рэалізм у мастацтве, то відавочна негрунтоўнасць такіх прэтэнзій. **(Апладысменты).** Партыя стаіць за комуністычную ідэйнасць, за социялістычны рэалізм у мастацтве. Але мы думаем, што ў рамках і на базе социялістычнага рэалізма могуць і павінны расцвітаць розныя творчыя почыркі, рознастайныя формы, розныя мастацкія індывідуальнасці, калі пры ўсёй сваёй індывідуальнасці мастак сваімі творамі служыць вялікім вызваленчым ідэям, стварэнню сапраўды чалавечнага гарманічнага ладу, дапамагае эстэтычнаму выхаванню народа, уносіць у духоўныя багацці грамадства сапраўдныя каштоўнасці, а не дзяшовыя падробкі. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

Некаторыя мастацтвазнаўцы вельмі спрашчаюць пытанне аб сувязі мастацтва з палітыкай, з жыццём. Няправільна было-б, да прыкладу, адзін толькі факт выбрання мастаком актуальнай тэматыкі разглядаць, як бяспрэчны доказ сувязі яго творчасці з палітыкай, з жыццём, як няправільна і кур'ёзна было-б выдатна выкананы пейзаж аб'яўляць апалітычным або безыдэйным творам. **(Апладысменты).** Або ўзяць іншы момант. Мастаку з пэўнай манерай пісьма не падабаюцца прыёмы карыстання фарбамі другога мастака—і чуваць папрокі, што гэта «чужыя прыёмы», «аджыўшыя метады», «рэакцыйная манера» карыстацца святлом або фарбамі. Затое, зразумела, прыёмы, уласцівыя самому «строгаму суддзі», аб'яўляюцца адзіна прагрэсіўнымі, революцыйнымі... **(Смех. Апладысменты).** У такіх разважаннях няма правільнага разумення ні палітыкі, ні мастацтва. І ў палітыцы, і ў жыцці, і ў мастацтве ўсё абстаіць куды больш складана.

Мы адносімся рэзка непрымірыма да ўсяго, што звязана з уплывамі рэакцыйнай ідэалогіі, тэорыі «чыстага мастацтва», апалітычнасці і безыдэйнасці. А ўсе гэтыя ўплывы адлюстроўваюцца і ў галіне мастацкай формы. Але гэта не мае нічога агульнага са спробамі адвольна і негрунтоўна абяднаць, уніфікаваць, звузіць рамкі совецкага мастацтва. Социялістычны рэалізм па самой сваёй прыродзе патрабуе смелай і рашучай барацьбы за **рознастайнасць** у мастацтве, за **багацце** мастацкіх з'яў, прыёмаў, почыркаў, стыляў, калі яны служаць інтарэсам народа, калі мастак дорыць нам творэнні, **якія ўзбагачаюць і ўпрыгожваюць** жыццё народа, а не чортапалох і бур'ян, а тым больш не ядавітыя расліны. **(Апладысменты).**

Троба не баяцца, а радавацца рознастайнасці мастацкіх почыркаў, непадобнасці манер розных мастакоў. Вельмі добра, што жывапіс П. Канчалоўскага або В. Бакшэева не падобны на жывапіс А. Пластова, а М. Сар'ян піша не так, як С. Чуйкоў або С. Грыгор'еў, хоць усе яны выдатныя мастакі. У В. Фаворскага свая графічная манера, не падобная на манеру І. Паўлава. Вельмі добра, што ў Т. Яблонскай свае прыёмы, якія адрозніваюцца ад прыёмаў А. Герасімава, што А. Шаўкуненка працуе ў іншай манеры, чым У. Танеыкбаеў, у С. Каненкова, В. Мухінай, З. Азгура, Т. Залькална — розныя «скульптурныя почыркі», але гэта не перашкаджае нам цаніць усіх гэтых таленавітых скульптараў. **(Апладысменты).** Вельмі добра, што ў нашым рэалістычным мастацтве гучаць таксама цудоўныя рамантычныя матывы—без рамантыкі, без мары мастацтва шэрае і бледнае. **(Апладысменты).** І адна з задач Саюза мастакоў—больш рашуча заахвочваць гэтую рознастайнасць почыркаў, больш смела падтрымліваць маста-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

Масква. Першы Усесаюзны з'езд совецкіх мастакоў. У прэзідыуме з'езду. Справа налева—М. Сар'ян, І. Яблонская, П. Корын, С. Герасімаў, Д. Шмарынаў і Б. Іягансон.

У фае Калоннай залы Дома саюзаў. Дэлегаты з'езду аглядаюць сяброўскія шаржы мастака Ф. Рэшэтнікава. (Фотахроніка ТАСС).

Заканчэнне прамовы тав. Д. Т. ШЭПІЛАВА

кой розных манер, рабіць усё для лапамогі таленту і майстэрству. Чым большы ўклад зробіць кожны мастак у агульную скарбніцу совецкага мастацтва, тым паўней будзе гэтая скарбніца і тым хутчай мы пакончым з усякімі праявамі безабліччасці, шэрасці, бескаляровасці, з якімі мы не хочам мірыцца. **(Апладысменты).** І, зразумела, трэба назаўсёды пакончыць са спробамі уніфікацыі мастацкай творчасці, за якую змагаюцца некаторыя крытыкі.

У свой час Стасаў пярэчыў суворынскай газеце «Новое время», крытык якой разносіў карціны Верашчагіна, спасылаючыся на тое, што Верашчагін бачыць свет не так, як Леў Талстой.

«На графа Льва Талстога таксама вельмі добрыя спасылкі, няма чаго сказаць. Граф Леў Талстой цяпер ператварыўся ўжо, для пісьменніка «Нового времени», у калатушку, каб па галовах біць тых, хто не падабаецца. Хто сумняваецца, што Леў Талстой вялікі пісьменнік? Але хто-ж сказаў, што ўсе павінны ствараць свае творы толькі на яго манер і ні кроку ў бок? Што ў яго ёсць, то абавязкова і ўсе іншыя падавай, а не падалі — зараз бах па галаве. На, моў, табе, чаму ты не Леў Талстой! І проста, і разумна». **(Смех. Апладысменты).**

Хоць сярод нашых жывапісцаў няма яшчэ роўных па маштабу таленту Льву Талстому, ахвотнікаў ператвараць асобныя імёны ў калатушкі для ўздзеяння на іншадумных ёсць нямала. **(Смех. Апладысменты).** Таму і важна падкрэсліць, наколькі неправамерна атоесамляць метад социялістычнага рэалізма з дзейнасцю якой-небудзь асобнай групы мастакоў. Партыя кліча мастакоў да **смелай, творчай ініцыятывы, да ўсямернага ўзбагачэння мастацтва.** Няма сумнення, што шырокае развіццё творчага спаборніцтва мастакоў на аснове сумеснай барацьбы за справу народа, справу комунізма будзе служыць далейшаму прагрэсу совецкага мастацтва.

Праблемы социялістычнага рэалізма актыўна абмяркоўваюцца цяпер пісьменнікамі, мастакамі, кампазітарамі. Гэта тлумачыцца перш за ўсё тым, што ў самім мастацкім жыцці ёсць столькі новых працэсаў, столькі новых з'яў, што трэба іх асэнсаваць з пункту гледжання **метаду мастацтва.** З другога боку, імперыялістычныя сілы вядуць супраць нас ідэалагічную барацьбу, што абавязвае мастакоў у радзе іншых мер глыбей распрацоўваць і вастрэй ставіць тэарэтычныя праблемы развіцця мастацтва.

Усе варожыя нападкі на социялістычны рэалізм не могуць не толькі абвергнуць, але колькі-небудзь пахістаць непарушныя пазіцыі совецкага мастацтва ў гэтым пытанні. **(Апладысменты).** Чым больш стараюцца нашы працаўнікі, тым больш выразна відаць, што ім няма чаго сказаць па сутнасці і яны вымушаны задавальняцца нападкамі на асобныя няўдалыя творы, якія, дарэчы, самі совецкія мастакі раскрытыкавалі раней іх. Дарэмныя іх патугі ўкалоць самую сарцавіну совецкага мастацтва. Душа совецкага мастацтва застаецца неапаганенай — чыстая, светлая, высокародная душа! **(Бурныя апладысменты).**

Гаворачы аб дыялектычным метадзе. Ленін указваў, што гэта жывы, шматбаковы метад, які развіваецца, з безліччу адценняў падыходу да рэчаіснасці («Да пытання аб дыялектыцы») Гэта ў поўнай меры адносіцца і да метаду социялістычнага рэалізма, як метаду мастацтва, што з'яўляецца **жывым метадам, які пастаянна развіваецца** і які ўзбагачаецца разам з ростам мастацтва. Было-б недарэчна думаць, што тут усё да дэталей і навечна вызначылася і распрацоўваць больш няма чаго. Не, ёсць мноства пытанняў для паглыбленай распрацоўкі, для таварыскіх спрэчак, для навуковых дыскусій.

У друку, на сходах мастакоў выстаўлялася, у прыватнасці, прапанова разглядаць социялістычны рэалізм не як **творчы метад,** а як светапогляд мастака. Спрэчка тут ідзе не аб тэрмінах, а аб вельмі важных рэчах. Як відаць, гэтае пытанне стане і на вашым з'ездзе. Зразумела, што адным абмеркаваннем, а тым больш «указаннем» такія пытанні не могуць быць вырашаны. Але прапанова адмовіцца ад паняцця социялістычнага рэалізма як метаду не можа не выклікаць сур'ёзных пярэчанняў.

Марксісцка-ленінскі светапогляд дае ключ да разумення законаў грамадскага жыцця, ён дапамагае людзям арыентавацца ў самых складаных пытаннях сучаснасці, ён дае кіруючую ніць палітыкам, вучоным, нашым кадрам ва ўсіх галінах іх дзейнасці. Спробу побач з марксісцка-ленінскім светапоглядам паставіць яшчэ адзін светапогляд—социялістычны рэалізм—нельга разглядаць усур'ёз, гэта філасофска і палітычна негрунтоўна.

Метад—гэта спосаб вывучэння, пазнання і мастацкага адлюстравання рэчаіснасці, які дазваляе правільна разумець аб'ектыўныя законы самой рэчаіснасці. Марксісцкае, навуковае вызначэнне метаду выключае суб'ектывізм, выключае ўсякія спробы трактаваць метад як нейкую суму адвольных, абстрактна знойдзеных правілаў. Вызначэнне социялістычнага рэалізма як творчага метаду дае навуковыя крытэрыі і для ацэнкі твораў мастацтва.

Трактоўка социялістычнага рэалізма як светапогляду, а не як творчага метаду можа прывесці толькі да блытаніны важных паняццяў і адкрыць дарогу для суб'ектывізма. Само сабой зразумела, што пытанне гэтае патрабуе далейшай усебаковай тэарэтычнай распрацоўкі.

Рэалістычныя традыцыі і наватарства

Адным з актуальных пытанняў мастацкай творчасці, якія абмяркоўваліся ў асяроддзі мастакоў, з'яўляецца пытанне аб **рэалістычных традыцыях і наватарстве.** У буржуазным эстэцкім асяроддзі гучаць галасы (а да нас часам далятае рэха): рэалізм, моў, устарэў, ён непрыгодны для паказу сучаснасці, трэба адмовіцца ад «адсталага» рэалізма і стаць на шлях «наватарства».

Мы за наватарства. Пры самай высокай ацэнцы дасягненняў класічнага мастацтва мы разумеем, што ім не можа абмежавацца мастацкае развіццё чалавецтва. Наша жыццё, наша рэчаіснасць, сучасныя нам людзі, іх барацьба і праца, іх думкі і пачуцці, іх высокае маральнае аблічча, этычныя і эстэтычныя запатрабаванні—усё гэта ставіць перад нашым мастацтвам і перад сучаснымі мастакамі іншыя, больш складаныя задачы, выстаўляе круг ідэй новых і больш велічных, чым тыя задачы і ідэі, якія вырашала мастацтва мінулых стагоддзяў.

Заклік да мастакоў—ствараць творы, праўдзіва адлюстроўваючыя новы грамадскі лад—социялізм і новых людзей совецкай эпохі,—ужо ўключае ў сябе патрабаванні наватарства, пошукаў новых сродкаў выяўлення жыццёвага зместу. Але ці азначае гэта, што мы павінны вітаць **усякае** наватарства толькі таму, што яно не падобна на тое, што было раней?

Для нас наватарства ў мастацтве не самамэта, а такое далейшае развіццё мастацтва з выкарыстаннем усяго накопленага класічнага вопыту і майстэрства, якое дапамагае мастаку больш глыбока, ярчэй і ўсебакова раскрываць і адлюстроўваць рэчаіснасць, на аснове правільнага разумення працэсаў і законамернасцей рэальнага жыцця, яго дынамічнага развіцця.

Але ёсць і іншае разуменне традыцый і наватарства, пры якім мастак лічыць, што ён пачынае, так сказаць, на пустым месцы і ніяк не звязан з папярэднім развіццём мастацтва.

Партыя дае рашучы адпор такому ілжэнаватарству і пражэкцёрскім выдумкам. Ленін пісаў: «Не **выдумка** новай пролеткультуры, а **развіццё** лепшых узораў, традыцый, вынікаў **існуючай** культуры **з пункту гледжання** светапогляду марксізма і ўмоў жыцця і барацьбы пролетарыята ў эпоху яго дыктатуры». **(Апладысменты).** (Ленінскі зборнік, XXXV, стар. 147—148).

Ленін заклікаў развіваць лепшыя традыцыі айчыннага і сусветнага мастацтва, развіваць іх на аснове новых фактаў — социялістычнага жыцця, развіваць з новых пазіцый—навуковага, марксісцкага светапогляду.

У святле гэтых указанняў і трэба вырашаць пытанне аб наватарстве. Наватарства—у якім напрамку? Мы гаворым: абапіраючыся на класічную спадчыну — у напрамку далейшага паглыбленага пазнання мастацтвам рэальнай рэчаіснасці, грамадскага жыцця, у напрамку далейшага ўдасканальвання самога мастацтва і яго выяўленчых сродкаў. Такое разуменне наватарства вядзе мастакоў уперад, у яго ёсць ясная мэта, ёсць цвёрдая прынцыповая аснова.

Комуністычная партыя, В. І. Ленін не раз выкрывалі гора-наватараў і гора-абвяргальнікаў «старога». Нельга рабіць фетыша са слоў «новае» і «старое», трэба разабрацца **па сутнасці, які змест** укладваецца кожны раз у гэтыя словы. Не ўсё тое дрэнна, што старое, і не ўсё тое добра, што здаецца новым. Рэволюцыйнасць у жыцці і ў мастацтве заключаецца ў тым, каб умець на ўсе з'явы і старога і новага мастацтва глядзець з пункту гледжання інтарэсаў народа, выдзяляць у першую чаргу творчасць тых мастакоў, якія дапамагаюць народу правільна і глыбока разумець жыццё, якія сілай сваіх ідэй і мастацкіх вобразаў аб'ядноўваюць думку, волю і пачуцці народных мас, узнімаюць іх на барацьбу за стварэнне і развіццё новага, социялістычнага ладу. **(Апладысменты).**

Ф. Энгельс гаварыў аб той чароўнай сіле чалавечай рукі, якая выклікала да жыцця карціны Рафаэля, статуі Тарвальдсена, музыку Паганіні. Капіталістычны лад з прычыны ўласцівых яму найглыбейшых антаганістычных супярэчнасцей не можа быць руплівым хавальнікам і паклоннікам духоўных багаццяў, створаных майстрамі мастацкай творчасці. «Капіталістычная вытворчасць,—пісаў Маркс, —варожая пэўным галінам духоўнай вытворчасці, напрыклад, мастацтву і паэзіі». (К. Маркс, «Тэорыя прыбавачнай вартасці», ч. І, выданне 1955 г., стар. 261). У сучасную эпоху загнівання капіталізма асабліва выразна выступаюць працэсы нігілістычнага аплёўвання і апаганьвання ўсяго выдатнага, што створана чалавечымі рукамі.

Толькі социялістычнае грамадства з'яўляецца **законным наследнікам і самым гарачым знатаком** усіх духоўных скарбніц, накопленых чалавецтвам. **(Бурныя апладысменты).** Мы не з'яўляемся Іванамі, якія не памятаюць сваёй роднасці. Социялістычны рэалізм абапіраецца на ўсе прагрэсіўныя заваёвы сусветнага мастацтва. Будучы ўзбагачона ўсім вопытам барацьбы за социялізм, совецкае мастацтва само ўносіць уклад у гэтую вялікую справу. Ленін пісаў, што сапраўды свабодная, адкрыта звязаная з пролетарыятам літаратура будзе апладатвараць «апошняе слова рэволюцыйнай думкі чалавецтва вопытам і жывой работай социялістычнага пролетарыята» (Творы, т. 10, стар. 31). Не ілюстраваць агульныя палажэнні, а, ідучы ад вопыту барацьбы народа, уносіць свой уклад у развіццё чалавечай думкі, яго духоўнай культуры — вось задача мастацтва социялістычнага рэалізма! **(Апладысменты).**

Фальшывая мішура фармалістычнага «наватарства» часам прыцягвае асобных прадстаўнікоў мастацкай моладзі, якім падтрымка чагосьці «незвычайнага» здаецца самай р-р-рэволюцыйнай справай. Аднак у гэтых пошуках «незвычайнай» формы часам адыходзяць на задні план клопаты аб **ідэйным змесце,** аб жыццёвай праўдзівасці твораў, а гэта значыць—мяняць золата мастацкай праўды на іржавыя грашы арыгінальнічання. **(Апладысменты).**

Вядомы выпадкі, калі раптам узнікала шуміха то вакол скульптур, якія адлюстроўваюць мадэрністычныя ўплывы, то вакол карцін і малюнкаў, якія маюць пячатку ўплыву экспрэсіянізма, абстрактнага мастацтва і г. д. Сапраўдныя мастакі ніколі не памірацца з мяртвячынай фармалізму, мы лічым, што шлях абстрактнай фармалістычнай творчасці згубны, смяротны для мастацтва. **(Апладысменты).** Відавочна, сувязь асноўных палажэнняў гэтага мастацтва з суб'ектывісцкім, ідэалістычным буржуазным светапоглядам эпохі, калі ў старога ладу сатрасаецца глеба пад нагамі, будучыня для яго ідэалагаў невыразная і рэальныя сувязі рэчаў рэальнага свету пачынаюць знікаць.

Гістарычны вопыт красамоўна пацвярджае вялікую перавагу перадавога рэалістычнага мастацтва. І мы ўпэўнены, што совецкія мастакі будуць усімі сіламі актыўна змагацца за яго новыя перамогі. **(Апладысменты).** Разам з тым на вопыце гісторыі мастацтва, на аналізе сучасных з'яў у галіне мастацтва неабходна раскрываць паўнейшую негрунтоўнасць эстэцкіх, фармалістычных школак і плыней.

Гэта трэба рабіць, перш за ўсё, у імя стварэння сапраўды наватарскіх твораў ад нашым часе, аб нашых людзях. Карціны Сурыкава, Рэпіна, Серова, Левітана з велізарнай сілай адлюстравалі нашу краіну, яе людзей, грамадскае жыццё ў мінулым. Мы хочам, каб нашы мастакі з не меншай сілай расказалі аб краіне социялізма, аб яе імкненнях і цяжкасцях на шляху, аб вялікіх перамогах нашага народа-стваральніка, аб прыгажосці совецкага чалавека, які змагаецца з перажыткамі старога, каб людзі будучага пазнавалі нашу непаўторную, цудоўную эпоху па вашых палотнах, як мы сёння пазнаем мінулыя эпохі па палотнах Рэмбрандта або Рэпіна. І нам трэба адхіліць і пераадолець усё, што перашкаджае смеламу, таленавітаму, праўдзіваму адлюстраванню жыцця народа. **(Бурныя апладысменты).**

Бліжэй да жыцця народа

Совецкія мастакі правільна разумеюць свае задачы ў сувязі з рашэннямі XX з'езда партыі. Комуністычная партыя за апошнія гады зрабіла многае, каб узняць узровень жыцця народа, пераадолець недахопы, якія ёсць і ў гаспадарчым будаўніцтве, і ў галіне ідэалогіі і культуры, каб яшчэ больш паспяхова ісці ўперад. Уся дзейнасць партыі накіравана да таго, каб яшчэ больш плённа дзейнічалі творчыя сілы нашага народа, каб прывесці ў рух велізарныя разервы, якія тояцца ў нетрах нашага грамадства, выкарыстаць усе магчымасці, закладзеныя ў самой прыродзе социялістычнага ладу, з тым, каб жыццё кожнага працаўніка нашага грамадства станавілася ўсё лепшым і прыгажэйшым.

Для работнікаў мастацтва галоўнае заключаецца ў яшчэ большым збліжэнні з жыццём народа, у праніклівай увазе мастака да думак, пачуццяў і перажыванняў совецкага чалавека **Будзённае і гераічнае жыццё і барацьба совецкіх людзей, краін вялікай социялістычнай садружнасці павінны стаць сапраўды галоўнай тэмай нашага мастацтва.** Важнейшая задача Саюза мастакоў — дапамагаць майстрам мастацтва правільна разбірацца ва ўсёй складанасці жыццёвых з'яў і, не дапускаючы ні лакіроўкі, ні агульнага ахайвання, бачыць заканамернасці развіцця, глыбінныя працэсы і не змешваць магутны і жыватворчы паток з пенай на яго паверхні.

А між тым у некаторых мастакоў адчуваецца нейкая баязлівасць, няўпэўненасць у падыходзе да новых з'яў рэчаіснасці. Не можа не трывожыць, напрыклад, той факт, што за апошнія гады ў нас стала значна менш сюжэтных тэматычных палотнаў **вялікага жыццёвага зместу.** Справядліва крытыкавалі, напрыклад, нядаўнюю выстаўку Акадэміі мастацтваў. А нашым вядучым майстрам трэба было-б паказаць прыклад смелага, мэтанакіраванага звароту да вялікіх з'яў сучаснасці, высокай мастацкай патрабавальнасці. Але на выстаўцы было вельмі мала такіх работ.

Я прашу правільна мяне зразумець. Няма ні малейшага сумнення, што патрэбны і жанравыя карціны, і пейзажы, і нацюрморты, усё гэта ўзбагачае духоўны і эстэтычны свет чалавека. Але хіба не ясна, што асабліва каштоўныя для нас творы, якія адлюстроўваюць значныя з'явы социялістычнай рэчаіснасці, істотныя працэсы грамадскага развіцця. Карціны-ж перадвіжнікаў дапамагалі фарміраваць ідэйны і маральны свет перадавых людзей таго часу гэтак-жа, як вершы Некрасава або раман «Што рабіць?» Чарнышэўскага. Лепшыя-ж творы мастакоў і скульптараў фарміруюць душы людзей гэтак-жа, як «Узнятая цаліна» Шолахава або «Як гартавалася сталь» Остроўскага.

Мы не хочам прадпісваць мастакам, за якія тэмы ім «трэба» або «не трэба» брацца. Жывое грамадскае чуццё і мастакоўская цікавасць да жыцця, да людзей дапамогуць кожнаму знайсці сваю тэму. Але хочацца сказаць адно: чым больш значная тэма, тым бліжэй і даражэй яна думкам і пачуццям народа, тым да большай мастацкасці абавязвае яна аўтара. Чым больш значная тэма, тым большыя павінны быць дапамога і ўвага мастаку з боку органаў культуры, Саюза мастакоў.

Міністэрствы культуры СССР і саюзных рэспублік, як і Акадэмія мастацтваў, слаба, павярхоўна займаюцца мастацтвам. **(Апладысменты).** Кіраўніцтва-ж наогул, а кіраўніцтва ў галіне мастацтва асабліва нельга разумець як суму адміністрацыйных мерапрыемстваў, тут трэба вельмі ўважліва ўлічваць усю своеасаблівасць гэтага ўчастка чалавечай дзейнасці.

Было-б правільна сказаць, што работнікам мастацтва трэба перш за ўсё **дапамагаць. (Апладысменты).** Дапамагаць—гэта значыць умацоўваць у кожным тое добрае і перадавое, што ў ім ёсць, пераадольваць недахопы і менш па-ментарску павучаць. Горкі гаварыў, што трэба вельмі многа ведаць, каб мець права асцярожна раіць. **(Апладысменты).**

У творчых саюзах партыя заўсёды абапіралася на перадавыя, ідэйныя, таленавітыя творчыя кадры, падтрымліваючы іх барацьбу супраць адсталых, мяшчанска-анархічных элементаў, якія дзе-ні-дзе яшчэ не, не і праявяць сябе. У нас ёсць і ў далейшым будзе ідэйная барацьба, нам прыходзіцца выступаць супраць ідэйных праціўнікаў. Задача партыйных арганізацый заключаецца ў тым, каб правільна, з прынцыповых пазіцый, кваліфікавана накіроўваць ідэйную барацьбу, не дапускаючы адміністравання або абразлівай крытыкі, згуртоўваючы вакол карэнных творчых задач усе здаровыя прагрэсіўныя сілы мастацкай інтэлігенцыі. **(Апладысменты).** Правільна кіраваць —значыць накіроўваць сілай ідэй, дапамагчы мастаку стаць бліжэй да жыцця, распаліць у яго душы цікавасць да вялікіх тэм сучаснасці, стварыць у вялікім калектыве мастакоў такую атмасферу, якая садзейнічае пошукам новага, садзейнічае ўсяму сумленнаму, шукальнаму, перадавому, не дазваляе прыніжаць званне мастака несур'ёзнымі адносінамі да свайго таленту.

У гэтай сувязі трэба сказаць аб непрыймальнасці ў нашых умовах так званага мецэнацтва. Асобныя факты асабістага мецэнацтва ў мінулым у нас былі. Совецкае мастацтва—такая вялікая і цудоўная з'ява, што мецэнацтва з уласцівай яму апекай не адпавядае прыродзе нашага дэмакратычнага, народнага мастацтва. У нас ёсць адзін «мецэнат», адзін апякун, адзін вярхоўны суддя і знаток—гэта **народ. (Бурныя апладысменты).**

Мецэнацтва, а, з другога боку, голае адміністраванне, якое падмяняе ідэйнае выхаванне мастакоў, дробязная апека і канцылярская рэгламентацыя творчай працы, навязванне мастакам суб'ектыўных і часам некампетэнтных меркаванняў адміністратараў ад мастацтва—усё гэта павінна быць пераадолена, як адступленне ад ленінскіх норм і прынцыпаў кіраўніцтва ў галіне культуры. **(Апладысменты).**

Але, асуджаючы такія недахопы, мы змагаемся за **ўсямернае ўмацаванне і ўдасканальванне ідэйна-палітычнага, партыйнага кіраўніцтва мастацтвам, бо ў гэтым—залог яго правільнага развіцця і працвітання. (Бурныя апладысменты).**

Мы не можам не выступаць супраць глыбока памылковых тэорый «стыхійнага» развіцця мастацтва, супраць мяшчанска-эстэцтвуючых хістанняў, якія робяць часам уплыў на некаторых работнікаў мастацтва.

Барацьба за высокую ідэйнасць мастацтва, за яго сапраўды рэволюцыйную рамантычнасць, супраць апалітычнасці і песімізму, за глыбокае вывучэнне мастакамі жыцця народа, за яго эстэтычнае выхаванне, за тое, каб майстры выяўленчага мастацтва дапамагалі партыі выхоўваць моладзь бадзёрай, жыццерадаснай і адданай Радзіме,—вось у чым заключаецца пастаянныя клопаты партыі на гэтым важным участку ідэалагічнага фронта. **(Апладысменты).** У пераважнай большасці сваёй мастакі правільна разумеюць гэтыя задачы і бачаць у партыйным кіраўніцтве залог далейшага працвітання мастацтва.

Першы з'езд мастакоў павінен завяршыць работу па стварэнню адзінай, многанацыянальнай арганізацыі мастакоў Совецкага Саюза, заклікаў згуртаваць усе сілы мастакоў нашай краіны. Перад Саюзам неабдымнае поле дзейнасці, рознастайнасць пытанняў, пачынаючы з абмеркавання самых складаных праблем эстэтыкі, да актыўнага ўдзелу ў справе карэннага паляпшэння мастацкай адукацыі і практычнай работы па эстэтычнаму выхаванню насельніцтва. Саюз павінен у значна большай ступені, чым да гэтага часу, будаваць усю сваю работу **на дэмакратычных прынцыпах, на аснове найшырэйшай актыўнасці саміх мастакоў, на аснове калектыўнага розуму і калектыўнага кіраўніцтва. (Апладысменты).**

Перад з'ездам мастакоў і органамі калектыўнага кіраўніцтва, якія ён выбярэ, стаяць вялікія задачы. Сцвярджаючы вялікія ідэі будаўніцтва новага жыцця, ствараючы высокамастацкія творы, няспынна ўдасканальваючы сваё майстэрства, дзеячы мастацтва павінны не аслабляць барацьбы супраць эстэцка-фармалістычных і натуралістычных тэндэнцый, супраць рамеснага фатаграфізма, фальшывай і напышлівай пампезнасці, супраць чужых уплываў, ад якіх мы не застрахаваны і супраць якіх трэба трымаць порах сухім.

Толькі поўнасцю пераадолеўшы ўсякае сектанцтва і дагматычную вузкасць, усякую беспрынцыповую групавую барацьбу, Саюз мастакоў зможа сапраўды згуртаваць свае рады на прынцыповай, дзелавой творчай аснове.

З'езд мастакоў—вялікая падзея для лёсу выяўленчага мастацтва нашай краіны. Няма сумнення, што мастакі ўсіх народаў Совецкага Саюза пасля свайго з'езда з яшчэ большай настойлівасцю будуць працаваць над ажыццяўленнем задач, пастаўленых перад мастацтвам XX з'ездам партыі.

Пажадаем-жа вялікага поспеху ў рабоце з'езда мастакоў Совецкага Саюза, ва ўсёй творчай дзейнасці нашых выдатных жывапісцаў, скульптараў, графікаў, майстроў прыкладнога і дэкаратыўнага мастацтва, якія стварылі нямала цудоўных твораў і гатовы дастойна і ў далейшым ствараць духоўныя каштоўнасці на карысць і шчасце народа, які пад вадзіцельствам вялікай партыі комуністаў упэўнена ідзе да сваёй запаветнай мэты —да комунізма. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

На першым Усесаюзным з'ездзе мастакоў

Першы ў гісторыі совецкага выяўленчага мастацтва Усесаюзны з'езд — важнейшая падзея ў культурным жыцці нашай краіны. Даклад **Б. Іягансона,** садаклады па асобных жанрах, прамовы майстроў жывапісу, скульптуры і графікі разгарнулі карціну росквіту нашага мастацтва, яго здабыткаў і няўдач, асвятлілі натхнёную творчую працу майстроў совецкай мастацкай культуры на аснове метаду социялістычнага рэалізма.

Прывітанне ЦК КПСС з'езду і выступленне сакратара ЦК КПСС **Д. Шэпілава** поруч з прынцыповай партыйнай ацэнкай шляху, пройдзенага нашым выяўленчым мастацтвам, далі ясны кірунак да новага творчага ўздыму ва ўсіх жанрах.

Адкрываючы з'езд, старэйшы майстар жывапісу **К. Юон** заклікаў дбайна захоўваць і паглыбляць традыцыі высокай ідэйнасці і грамадзянскасці класічнага рускага і сусветнага мастацтва ў сучаснай творчасці, услаўляць народ і веліч яго подзвігу ў імя перамогі комунізма.

У дакладзе аб стане і задачах выяўленчага мастацтва старшыня аргкамітэта Саюза **Б. Іягансон** гаворыць аб барацьбе з варожымі ўплывамі буржуазнай ідэалогіі ў мастацтве, з перажыткамі антырэалістычных плыней, фармалізмам, натуралізмам і дэкадэнцтвам.

Ён напамінае аб здабытках у паказе новага чалавека-сучасніка, у праўдзівым адлюстраванні новых грамадскіх адносін, у развіцці партрэтнай манументальнай скульптуры. У перадваенны час поруч з работай рускіх мастакоў магутна разгарнуліся таленты мастакоў саюзных рэспублік — Я. Нікаладзе, М. Сар'яна, С. Чуйкова, А. Шэўкуненкі, А. Петрыцкага, В. Волкава, З. Азгура, У. Джапарыдзе.

У дні Айчыннай вайны ў жывапісных кампазіцыях дамінуючай была гераічная тэма вялікіх выпрабаванняў і мужнасці народа.

Б. Іягансон гаворыць аб кульце асобы, які неспрыяльна адбіўся на гісторыка-рэволюцыйным і партрэтным жанрах, аб стандартнасці, ілюстратыўнасці і трафарэтнасці многіх карцін, якія напісаны пад уплывам культу асобы.

Спыніўшыся на антынароднай сутнасці абстракцыянізма, які пануе цяпер у буржуазным жывапісу Захаду (гэта асабліва ярка прадэманстравала выстаўка ў Венецыі), дакладчык гаворыць і аб няправільных тэндэнцыях, што вызначыліся і ў нашай дыскусіі перад Усесаюзным з'ездам. З аднаго боку былі шкодныя спробы прыстасавань социялістычны рэалізм да рознага роду адхіленняў ад мастацкай праўды, і з другога боку—выдаць социялістычны рэалізм толькі як індывідуальную манеру асобных мастакоў. І гэта зніжае багацце рэволюцыйнага метаду творчасці.

На трыбуне **І. Сярэбраны,** які выступіў з дакладам аб совецкім жывапісу.

І. Сярэбраны падрабязна аналізуе ўсе этапы развіцця совецкага жывапісу за саракагоддзе пасля Вялікага Кастрычніка. Можна сцвярджаць, сказаў ён, што агульная накіраванасць нашага жывапісу ішла па шляху напісання твораў, блізкіх і зразумелых народу, па шляху выразнай палітычнай мэтаімкнёнасці. Совецкі жывапіс прапагандуе социялістычную ідэалогію і адыгрывае вялікую ролю ў эстэтычным выхаванні народа.

Аднак поруч з яркімі, сапраўды мастацкімі палотнамі, былі і такія, у якіх не вызначаўся густ, з шаблоннымі сюжэтамі. У іх глыбокія жыццёвыя канфлікты і сутыкненні характараў, харство акружаючага нас жыцця падаваліся збяднёнымі. Прычына гэтага — у адрыве мастака ад жыцця, у адсутнасці шырокага погляду і творчага бачання жыцця.

Крытыкуючы праявы фармалізма і натуралізма ў жывапісу, І. Сярэбраны раскрывае высокародную сутнасць метаду социялістычнага рэалізма.

У дакладзе шмат увагі аддадзена пытанню ўдасканалення майстэрства жывапісу.

Сіла мастацтва, зазначае дакладчык, вызначаецца адточанасцю і дасканаласцю гэтай зброі. Жывапіс валодае зброяй свайго пластычнага багацця. У жывапісу, як у музыцы і літаратуры, існуюць свае эмацыянальныя падтэксты, і менавіта яны, гэтыя падтэксты, гэта пластычнае багацце, знаходзяць самыя затоеныя дарожкі да сэрца гледача, узбагачаючы яго ідэйна і эстэтычна. Недаацэнка спецыфікі жывапісу, багацця пластычных магчымасцей колеру і формы, як магутнага сродку ўздзейнічання на гледача, нанесла вялікую шкоду развіццю совецкага жывапісу.

Садакład Н. Томскага аб скульптуры прачытаў **А. Бембель.**

Нараджэнне і пачатковы этап фарміравання совецкай рэалістычнай скульптуры непарыўна звязаны з імем вялікага Леніна і яго планам манументальнай прапаганды.

У дакладзе пералічаны вядомыя майстры манументальнай скульптуры: Н. Андрэеў, І. Шадр, В. Мухіна, С. Каненкаў, С. Меркураў і іншыя. Сярод іх названы і беларускія скульптары: З. Азгур, А. Глебаў, А. Бембель, С. Селіханаў. Совецкімі скульптарамі створана толькі ў пасляваенны час больш ста розных помнікаў, 113 бронзавых бюстаў двойчы і тройчы Героям Совецкага Саюза, манументальныя, высечаныя ў граніце статуі Леніна, помнікі А. М. Горкаму і выдатным совецкім палкаводцам. Аднак многае яшчэ належыць зрабіць нашым майстрам скульптуры. Так, да гэтага часу яшчэ няма ў Маскве помнікаў Марксу, Энгельсу і Леніну. Няма манументаў, прысвечаных падзеям 1905 года, Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі, Вялікай Айчыннай вайне. Нажаль, і сярод некаторых існуючых помнікаў прыкметны штамп, неглыбокае вобразнае вырашэнне, паўтарэнне надакучлівых кампазіцыйных схем у статуях і пастаментах. Адмоўная з'ява — устанаўленне ў розных гарадах аднолькавых статуй, што прыводзіла да іх стандартызацыі. На апошніх усесаюзных выстаўках амаль не было скульптурных кампазіцый з вялікім абагульненнем і глыбокім сэнсам.

Спыніўшыся на здабытках і заганах манументальна-дэкаратыўнай скульптуры, садакладчык аналізуе праблему сінтэза архітэктуры і скульптуры, разглядае пытанне аб тым, ці магчыма выкарыстанне сімволікі і алегорыі ў совецкай манументальнай скульптуры, выказвае свае крытычныя заўвагі аб адносінах да спадчыны імпрэсіянізма.

У дакладзе падкрэслена вялікае значэнне скульптурнага партрэта для ўвасаблення гераічнага вобраза совецкага чалавека, шматфігурных кампазіцый, жанравай скульптуры, прасторавага тэматычнага рэльефа, садова-паркавай і керамічнай скульптуры.

«У нашай скульптуры,—гаворыць дакладчык, — ішла актыўная барацьба з праявамі фармалізма, з безыдэйнасцю, эстэцтвам, і гэта, бясспрэчна, прынесла ёй вялікую карысць». Разам з тым за апошні час у скульптуры ўзмацніліся натуралістычныя тэндэнцыі, імкненне да стварэння такіх фігур у якіх правільна размешчаны атрыбуты, але тэма не раскрываецца пластычнымі сродкамі. Няўменне абагульняць, раскрываць галоўнае, абыякавасць прыводзяць да нараджэння твораў, якія не хвалююць гледача.

У садакладзе ставіцца перад мастакамі задача — актыўна рыхтавацца да выстаўкі, прысвечанай саракагоддзю Совецкай улады.

Праблемам совецкай графікі быў прысвечаны садаклад **Н. Жукава.**

Н. Жукаў дае ацэнку лепшых работ графікаў і аддае значную ўвагу аналізу прычын, якія замінаюць больш плённаму развіццю жанра. Ён гаворыць аб слабай вобразнай выразнасці многіх твораў станковай графікі, аб недастатковай надзённасці іх тэматыкі, пра аднастайнасць кампазіцыйных прыёмаў у гэтым жанры. У садакладзе шмат увагі аддадзена праблемам развіцця эстампа і асабліва кніжнай ілюстрацыі. Тут ёсць багата ўдач, асабліва ў творчасці Шмарынава, Дубінскага, Кукрыніксаў, Верэйскага, братоў Ткачовых і ў многіх іншых майстроў ілюстрацый.

Між тым, гаворыць Н. Жукаў, у многіх саюзных рэспубліках — Казахстане, Азербайджане, Беларусі — ілюстрацыйная графіка па свайму ідэйна-мастацкаму ўзроўню і па колькасці твораў адстала ад скульптуры і жывапісу.

Садакладчык падрабязна спыняецца на праблемах прамысловай графікі, майстэрства рысунка — «першаасновы выяўленчага мастацтва».

Садакладчык аб палітычным плакаце **В. Іванову** прыгадаў думку М. І. Калініна аб тым, што «... карціна — гэта прапаганда, а плакат — агітацыя». І сапраўды, палітычны плакат — адна з самых народных і наглядных форм палітычнай агітацыі, адзін з самых масавых відаў совецкага выяўленчага мастацтва.

Змагаючыся супраць мадэрнізма і буржуазнага рэкламнага плаката, Моор, Дэні, Чэрэмных і Маякоўскі ў «Вокнах РОСТА» і іншых творах сцвердзілі прынцыпы, якімі цяпер кіруюцца майстры гэтага жанра. Гэта ідэйная мэтаімкнёнасць і палітычная страснасць, надзённасць і аператыўнасць водгуку на падзею, актыўнасць і выразнасць формы, масавасць плаката, які звернуты да самага шырокага гледача.

Спыніўшыся на вялікай ролі плакатаў у дні вайны і мірнага социялістычнага будаўніцтва, на здабытках у гэтым жанры, В. Іванову гаворыць аб тым, што плакатнае мастацтва ўсё яшчэ адстае ад патрабаванняў жыцця. Баявая агітацыя часта падмяняецца констатацыяй агульнавядомых ісцін. У плакаты, насуперак асаблівасцям жанра, часта пранікалі станкавізм і фатаграфізм. Тут таксама прыкметны тэндэнцыі нівеліроўкі мастацкіх почыркаў, рамесніцтва.

Мастацтвазнаўства і крытыка былі тэмай садаклада **М. Алпатава.**

Ацэньваючы перадз'ездаўскую творчую дыскусію, М. Алпатаў падкрэслівае, што пераважная большасць совецкіх мастакоў і крытыкаў трывала абараняе пазіцыі социялістычнага рэалізма, смела падтрымлівае социялістычнае наватарства ў сучасным мастацтве. Нажаль, заявіў дакладчык, дыскусія паказала і тое, што мы яшчэ не навучыліся спрачацца па-таварыску, па-сяброўску. Былі і такія «прыёмы» палемікі, калі апаненту прыпісваліся погляды, якія ён не выказваў, з тым, каб ачарніць яго. Некаторыя аўтары артыкулаў не цураліся і падтасоўкі фактаў, абы абвяславіць апанента.

Беспрынцыповасць і кан'юнктуршчына, слушна заяўляе садакладчык, — страшэнная загана нашай крытыкі. «У друку неаднаразова адзначалася, што самыя небяспечныя людзі — гэта тыя, хто з кожным уздымам на новую ступень змяняе арыентацыю, як добра змазаны флюгер. У кожны дадзены момант яны маюць рацыю, але ў цэлым прыносяць велізарную шкоду нашай справе, таму што іх прыклад падрывае веру ў крытыка, у яго сумленнае слова».

М. Алпатаў спыняецца на задачах стварэння падручнікаў па гісторыі рускага і совецкага мастацтва, гаворыць аб неабходнасці больш прынцыпова і канкрэтна ацэньваць творчасць класікаў і нашых сучаснікаў. Неабходна кансалідацыя крытычных кадраў на аснове марксісцка-ленінскай метадалогіі.

Пытанні тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва — тэма садаклада **Н. Акімава.**

Напомніўшы, што ў нас у краіне тэатр вырас у сапраўднае агульнанароднае масавае мастацтва, ён дае агляд гісторыі совецкага тэатральна-дэкарацыйнага м

Ілюстрацыі да кнігі

Каб добра праілюстраваць кнігу, мастаку неабходна глыбока зразумець яе ідэю, своеасаблівасці. Толькі ў гэтым выпадку мастак здолее перадаць у малюнку характары герояў.

А. Волкаў выканаў ілюстрацыі да паэмы Якуба Коласа «Новая зямля», выдадзенай Вучэбна-педагагічным выдавецтвам БССР.

У першым раздзеле паэмы — «Лесніковa пасада» — падаецца надзвычай яскравы малюнак сядзібы Міхала.

У глыбі двара стаяла хата
І выглядала зухавата
Паміж запушчанай будовы...

Чаму-ж хата лесніка выглядала так? Ды таму, што сядзіба не належыць Міхалу. Аднак А. Волкаў лесніковy сядзібу паказаў як сядзібу заможнага селяніна-ўласніка. Колас апісвае ўсе абставіны жыцця і побыту беларускага селяніна. Розныя прадметы ўжытку, аб якіх расказваецца ў паэме, створаны рукамі лесніка. Таму ён і адносіцца да іх з выключнай клапатлівасцю.

Мастак-жа не ўлавіў гэтай думкі твора паэта. На малюнку мы бачым, што пад адкрытым небам стаіць пакінуты перадок ад воза, чаго ні ў якім выпадку не магло быць у працалюбнага і ашчаднага гаспадара.

Беларускі селянін да Кастрычніцкай рэвалюцыі быў прыгнечаны і занядбаны. Але прыходзілі часіны, калі ў яго злосць і гнеў супраць сваіх прыгнятальнікаў прарываліся наверх. Гэтая асаблівасць у характары падняволнага чалавека тонка заўважана паэтам і з выключнай сілай перададзена ў раздзеле паэмы «На панскай службе»:

Чаго, пан, гэтак раскрычаўся?
Завошта, пан, мяне так лае?
Згарыць яна няхай такая
І служба гэта, і пасада,
І гэта крыўда, й гэта здрада,
І гэта панская адплата!..
Няхай яна будзе праклята!..—
Міхал тут плюнуў, завярнуўся—
Хоць раз, ды добра агрызнуўся!

Мастак-жа не ўявіў гэтага, у выніку ілюстрацыя атрымалася бледнай. Той злосці і таго абурэння лесніка, якія так выразна паказаў Я. Колас, няма на малюнку. Мы бачым, як Міхал стаіць перад панам, зняўшы шапку, хмурыць бровы і па-дзіцячаму сціскае правую руку ў кулачок. Таму і незразумела, навошта пан адхіснуўся ад яго.

Я. Колас не толькі аллюстроўвае цяжкае, падняволнае жыццё лесніка. Паэт паказвае і радасныя мінуты ў яго жыцці. Так, напрыклад, у раздзеле «Пагляд пчол» апісана сялянская гулянка. Да лесніка з'ехаліся ў госці яго сваякі і знаёмыя. Людзі выпілі па чарцы, і, натуральна, пачалася ажыўленая гутарка, танцы. У тым, як танцаваў гаспадар, адчуваецца спіцпласць і далікатнасць беларускага селяніна.

Сам гаспадар з кумой Анэлькай,
Руку прыгнуўшы над камэлькай,
На панскі лад мяце-вальцуе,
Усіх далікатнасцю касуе.

Шкада, што А. Волкаў не выявіў характэрных рыс людзей у час весялосці. Ён паказаў звычайную п'яную гулянку: жанчына вытанцоўвае трапака, а мужчыны, захапляючыся ёю, пляскаюць у ладкі. А гэта-ж зусім не характэрна для той гулянкі, пра якую піша Я. Колас.

Не перадаў мастак і журботных матываў, якімі прасякнута карціна вечарынкі. Заканчваюцца танцы, і сяляне зноў павінны прымацца за цяжкую працу, зноў наступае шэрая будзённасць, падняволная панская служба. Госці спяваюць песню, ад якой павявае смутакам, стратай чагосьці добрага, радаснага. Паэт заканчвае гэты эпізод словамі:

І нейкі жаль нясноай страты
Ад гэтай песні патыхае.
На свеце ўсё канец свой мае...

Нажаль, мастак нічога гэтага не перадаў у сваіх малюнках. Намнога збеднена ў ілюстрацыях жыццё дзяцей, пра якое эмацыянальна, з цёплым гумарам піша Я. Колас. Мастак не знайшоў нічога лепшага, як толькі паказаць кволую постаць хлопчыка, які з кніжкай пад пахай стаіць за хлявом.

Сярод удалых работ А. Волкава трэба адзначыць малюнак да раздзелу «Воўк». У ім, хоць і эскізна, выяўлены характар беларускай прыроды. Трапна акрэслены і тып селяніна-лесніка з паляўнічай стрэльбай у руках.

Можна лічыць удалым і малюнак да апошняга раздзелу паэмы—«Смерць Міхала». Аднак мастак чамусьці ў рэалістычную сцэну ўводзіць містычны элемент. На заднім плане малюнка мы бачым нейкі злавесны сілуэт, які толькі перашкаджае правільнаму ўспрыманню жыццёвых з'яў, апісаных у паэме.

А. Волкаў часта сам парушае партрэтнае падабенства вобразаў. Так, напрыклад, героя паэмы Міхала ён у розных месцах малюе чамусьці па-рознаму.

Ілюстрацыі да «Новай зямлі» А. Волкаў зрабіў без уліку характару вобразаў і мастацкіх асаблівасцей твора. З выключным майстэрствам напісаны паэтам у творы багатыя пейзажы беларускай прыроды. І вельмі крыўдна, што іх амаль не знойдзеш у ілюстрацыях А. Волкава.

Ан. УС.

«М. В. Фрунзе гутарыць у вёсцы з сялянамі напярэдадні сялянскага з'езду 1917 года». Рысунак мастака А. Кроля, набыты музеем Айчыннай вайны для новай экспазіцыі да 40-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі.

Спяваюць новасёлы

«Кустанайскаму абласному Дому народнай творчасці». У гэты адрас з Маладзечна сёлета адпраўляецца ўжо другая пасылка. Гэта абласны Дом народнай творчасці пасылае рэпертуар для ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці, якія паехалі з Беларусі на асваенне палінных і абложных зямель Казахстана.

Беларускія новасёлы атрымалі зборнікі песень самадзейных кампазітараў Маладзечанскай вобласці «Спявае наш край», беларускія народныя танцы, адноактовыя п'есы, творы нашых пісьменнікаў, афішы, рэклямы, плакаты і планы работы лепшых дамоў культуры і сельскіх клубаў рэспублікі.

У пісьме да новасёлаў работнікі Маладзечанскага Дома народнай творчасці падрабязна расказваюць, як прайшлі ў вобласці раённыя святы песні, агляды мастацкай самадзейнасці і эстафеты культуры.

У перыяд падрыхтоўкі да Усесаюзнага фестывалю моладзі ў соўгасах Кустанайскай вобласці беларускія юнакі і дзяўчаты стварылі рад новых калектываў мастацкай самадзейнасці. Цяпер яны рыхтуюць новыя праграмы канцэртаў. У рэпертуары асноўнае месца займаюць беларускія народныя песні, танцы, творы пісьменнікаў нашай рэспублікі.

Выступленні мастацкай самадзейнасці нашых землякоў карыстаюцца вялікай папулярнасцю сярод моладзі брацкіх рэспублік.

Днямі з Кустаная ў Маладзечна прыйшло пісьмо. У ім ад імя беларускай моладзі, якая паехала па закліку партыі на асваенне зямель Казахстана, выказваецца падзяка работнікам абласнога Дома народнай творчасці за іх клопаты аб сваіх земляках.

О. ДЫГАЙЛА.

ТЭАТРАЛЬНАЯ ХРОНІКА

Калектыў тэатра оперы і балету паказаў гледачам балет «Карсар» А. Адама (па паэме Дж. Байрана).

Дырыжыраваў І. Абраміс, пастаноўку ажыццявіў народны артыст БССР С. Дрэчын; касцюмы і дэкарацыі заслужанага дзеяча мастацтва БССР П. Масленікава. У галоўных ролях выступілі Н. Давыдзенка, С. Дрэчын, Б. Карпілава, Э. Піно, А. Карзянкова, В. Давыдаў, В. Міронаў і іншыя.

Спектакль прайшоў з поспехам.

* * *

Тэатр юнага гледача паказаў камедыю югаслаўскага драматурга Дабрычаніна «Тры салаўі, д. 17». Спектакль пастаўлен заслужаным артыстам БССР В. Пацехіным.

* * *

Рэпертуар Гродзенскага абласнога тэатра папоўніўся новай работай. Гледачам паказаны спектакль «Жаніцьба Фігаро». Яго паставіў рэжысёр І. Папоў. Ролю Фігаро выконвае заслужаны артыст БССР Г. Глінаедскі. У ролі Сюзаны выступае заслужаная артыстка БССР С. Іванова. У спектаклі заняты таксама артысты А. Панкрат, М. Папова, А. Макарава і іншыя.

* * *

У тэатры оперы і балету адбылося пасяджэнне мастацкага савета, на якім абмяркоўваліся два новыя оперныя лібрэты—«Салаўіны бераг» А. Бялевіча і «Павел Карчагін» П. Падкавырава.

У спрэчках выступілі К. Мулер, Д. Лукас, Л. Любімаў, М. Гульман, У. Даніловіч, П. Мільто, А. Бялевіч, Р. Млодак, М. Дзяніса́ў, П. Лютаровіч, якія адзначылі, што лібрэты «Салаўіны бераг» і «Павел Карчагін» патрабуюць істотнай літаратурнай дапрацоўкі. Аўтары лібрэта згадзіліся са слушнымі заўвагамі і будуць працягваць работу над творамі.

Цікавая сустрэча

«Вобраз жанчыны ў совецкай літаратуры»—так называўся вечар, які адбыўся гэтымі днямі ў клубе Мінскага аўтарамонтнага завода. З дакладам выступіў выкладчык Беларускага дзяржаўнага універсітэта Н. Лапідус.

Аб сваёй рабоце над вобразамі расказала артыстка тэатра імя Я. Купалы В. Галіна. З цікавасцю праслухалі прысутныя выступленні Л. Шаршнёвай—маці праслаўленай партызанкі Рымы Шаршнёвай, рэдактара часопіса «Работніца і сялянка» Ал. Ус. Паэтэса Э. Агняцвет прачытала новыя вершы.

Падзяка воінаў

Палітычнае ўпраўленне Беларускай ваеннай акругі вынесла падзяку калектывам мінскіх тэатраў, эстраднаму аркестру пад кіраўніцтвам Леаніда Уцёсава, харавой капеле БССР, народнаму хору, філармоніі, эстрадзе, ансамблю песні і танца Беларускай ваеннай акругі, хору Беларускага радыё, тэатральна-мастацкаму інстытуту, Мінскаму музычнаму вучылішчу, пісьменнікам М. Калачынскаму, А. Міроўаву, Н. Гарулёву, П. Прыходзьку А. Лазнявому, А. Есакову, кампазітарам Я. Цікоцкаму, Р. Пуксту, П. Падкавыраву, Ю. Семяняку, артыстам К. Ясінскай, О. Брыгвадзе, Н. Швейко, Н. Пігулеўскаму за ўдзел у дэкадзе шэфскага абслугоўвання салдат і сержантаў Мінскага гарнізона, прысвечанай 39-й гадавіне Совецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту.

Пісьменнік і чытач

Слабыя вершы

Нядаўна я атрымаў новы часопіс «Беларусь», нумар першы за 1957 год. Адгарнуў некалькі старонак—і вось вершы: Максім Лужанін, «З падарожнага». Дай, думаю, пачытаю. Я, наогул, цікаўлюся рыфмаванымі радкамі. Але ад гэтых вершаў я зусім разачараваўся, і проста балюча стала на сэрцы, што часопіс «Беларусь» змяшчае іх на сваіх старонках. Ну, якія гэта вершы? Паспрабуем разабраць некаторыя з іх.

Возьмем верш «Вадаспад». Ніякага вадаспаду тут не атрымалася. Ён увесь каменны. Тут

Каменны кош
млынар каменны
каменным зернем засыпаў.

Аўтар настолькі яго перасыпаў каменнем, што цяжка дабрацца да сэнсу.

Або: выдумана яшчэ нейкая «ніштаватая вышыня», «дзівосы дзіўныя» і г. д.

У вершы «Куст» пераблытана ўсё—і кусты, і рабіна. Ну дзе хто бачыў, каб на кусту ды раслі ягады рабіны?

Возьмем яшчэ верш «Радкі мае». Аўтар яўна не лічыцца з сваёй творчасцю. Уласныя аднатомнікі ён называе бяздомнікамі. Яны «заціснуты шклянымі дзверцамі ў пыльны змрок бібліятэк». Аўтар ведае, што яго вершы ўжо не сышчуцца, не вернецца ніводзін з іх, а проста «новы верш напішацца, а заўтра зноў... і лепш за ўсіх».

Няхай-бы ён напісаў верш хоць не лепш за ўсіх, але каб ён быў выразны. Яго верш «Роздум» зусім незразумелы чытачу. Тут напісана:

Стукну-грукну ў дзверы сонечныя:
— Добры дзень!
— Добры дзень.
Нідзе не дзенешся,
Стала ў цень.
Вусны сціснуты дзяўчыніны...
Выбірайся і з сянец,
маладзец!
Тут выходзіць ад варот
паварот...

Аўтару гэтых «чаканных» вершаў, памойму, трэба было-б больш сур'ёзна аднесціся да сваёй паэзіі, а часопісу «Беларусь» прад'явіць больш патрабавальнасці нават да твораў вядомых пісьменнікаў.

П. ВЕРАБЕЙ,
студэнт рэдактарскага факультэта МЗПІ.

Ці заўсёды чытач мае рацыю?

Атрымаўшы першы нумар часопіса «Беларусь», як заўсёды, я спярша пачаў чытаць паэзію, вядома, не ведаючы пра тое, што ў гэты час у Чэрвені такой-жа справай займаецца Пятро Верабей. Мая ўвага спынілася на нізцы вершаў Максіма Лужаніна «З падарожнага». Невялікую плошчу займае яна—сем вершаў на палову часопіснай старонкі. Прачытаў, і захацелася яшчэ раз, больш уважліва пазнаёміцца з імі.

Мне падабаюцца новыя вершы Максіма Лужаніна, якія цяпер часта сустракаеш у нашых часопісах і газетах, яны вызначаюцца глыбока чалавечнаю інтанацыяй і майстэрствам, чытаючы іх, бачыш, на якой вышыні сёння знаходзіцца беларускі верш. У Лужаніна бярэ цябе ў палон моўная стыхія, і ты добра адчуваеш і бачыш святло слова, якое дасталася з нечапанай глыбіні народнай мовы. Мусіць, гэтае святло і меў на ўвазе С. Маршак, калі пісаў свой вядомы «Слоўнік»:

Шчырэй гледжу я ў слоўнік з кожным
днём.
Пачуцці у радках яго іскрацца.
У слоў скляны апусціцца мастацтва
Не раз яшчэ з таемным ліхтаром.
(Пераклад С. Дзергая).

Шчырасцю, глыбінёй думкі вызначаецца і нізка «З падарожнага»: тут і жывыя, поўныя шчаслівага і крыху разважлівага захаплення ўспаміны аб Чэхаславакіі, гарыстай краіне, дзе «не тужыш па доме»; і сталы роздум аб паэзіі, якая заўсёды — «гарачынёю і ў мароз» — павінна быць «на сцежках баравых, на трактах, на шляхах чыгуначных»; сустрэнем тут і пагляд немаладога ўжо чалавека, якому «і свет вышэй, і сонца вышай, і меней для жыцця пагроз: яшчэ бялей пялёсткі вішань і зеляней лісты бяроз»; і зусім маладыя, вясёлыя вершы аб юнацкіх забавах. Усё зроблена як след, трывала, не на адзін дзень. Не знойдзеш тут высевак «лірычнага шырпатрэбу»—танных слоў без колеру і паху, слоў з халодным звяннем цацак на новагодняй ёлцы. Гэта рэчы ясныя, вобраз успрыймаецца і адчуваецца ва ўсіх вымярэннях — зрокавых і гукавых—і пададзены ён лагічна, развіваецца да канца:

З далёкай стромае вяршыні
Звісаў, як нітка, ручаёк,
І я пайшоў насупраць плыні,
Каб дакапацца — дзе клубок?
. . . . . .
...Ударыў гром, і поруч з гэтым
Пабег ручай, за ім другі!
Вясна здароўкаецца з летам, —
На Татрах растаюць снягі.
І зноўку загрымела глуха,
У скалах пашчапаўся гук —
Злуе завея-папрадуха,
А пража ўсё сплывае з рук.
(«Ручай»)

Нядаўна таварышы з рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» паказалі мне ліст Пятра Вераб'я. У тав. Вераб'я наміры сур'ёзныя і вялікія, у прыпісцы да артыкула ёсць такія словы: «Калі яна (заметка) будзе апублікавана, у мяне з'явіцца жаданне напісаць яшчэ што-небудзь. Гэта прынясе шмат карысці для мяне, для таго, аб кім я буду пісаць, і нашай агульнай справе—развіццю нацыянальнай літаратуры». Не буду падкрэсліваць не зусім правільную будову сказа: раней мяне гэта павінен быў заўважыць аўтар ліста—рэдакцыйны супрацоўнік і студэнт 3-га курса рэдактарскага факультэта Маскоўскага завочнага паліграфічнага інстытута.

Мяне непакоіць другое. Я думаю пра пачуццё густу, аб выхаванні мастацкага густу і разумення — у шырокім сэнсе слова—паэзіі. Гэта мае прынцыповае значэнне не толькі ў літаратурнай справе. Чалавек, здавалася-б, падрыхтаваны разумець прыгожае, у жыцці не змог вызначыць сапраўдную вартасць рэчаў. На пачатку тав. Верабей прызнаецца: «Я, наогул, цікаўлюся рыфмаванымі радкамі». Ды вось напаткала бяда: «... ад гэтых вершаў я зусім разачараваўся (падкрэслена мною—**А. В.**), і проста балюча стала на сэрцы, што часопіс «Беларусь» змяшчае іх на сваіх старонках. Ну, якія гэта вершы? Паспрабуем разабраць некаторыя з іх».

Паспрабуем.

Вось пачатак «Вадаспада», які цытуецца і ў лісце:

Той шум нізрынуўся імгненна,
Як быццам, перакрыўшы стаў
Каменны кош
млынар каменны
Каменным зернем засыпаў.
У горных жорнах перацёрты,
Па схіле, як па латаку,
Паток ссыпаўся, распрасцёрты,
І ніцма падаў у раку.

Цудоўны малюнак! Бачыш, як струменіць, чуеш, як шуміць вадаспад. І рытм верша такі-ж імклівы, як бурлівая плынь, і азначэнне «каменны» тройчы ўжыта не дзеля слоўнай гульні, а якраз да месца: чутно, як нястрымная, успененая плынь на сваім шляху варочае каменне, і гэтыя валуны, «галышы» і проста каменчыкі перакатваюцца, грымяць у віры патока. Пасля радкоў, дзе гром і скрыгат, пасля слоў, дзе багата «р» (у жорнах горных перацёрты») раптоўна зазвялі лёгкія, лагодныя радкі з мноствам «л», «с», быццам перад вачамі ў вясёлках пырскаў, распрасцёрты ніцма,

Па схіле, як па латаку,
Паток ссыпаўся...

А гэтая вада ў рацэ, што «аж пальцы ломіць»! Хоць тут і ўспомніш талстоўскую «жалезную ваду», усё-ж перад табой вобраз новай якасці, адчуваеш, быццам апёк ты пальцы ў сцюдзёным горным быстраку: «Як выхапіш—яны ў агні...»

Я там хадзіў крыху шчаслівы,
Захоплены з дзівос дзіўных,
Што ацярушваліся млівам
Бліскучых пырскаў вадзяных.
А ў аднае з маіх сябровак,
З кім заглядзеліся ў струмень,
На кожнай вейцы сто вясёлак
Вячорны выкрасаў прамень.

Здаецца, мы разам з паэтам пастаялі каля адной з Татранскіх Ломніц, дзе гулка грыміць у гарах вадаспаднае рэха. Толькі тав. Верабей, «разачараваўшыся», сумотна сцвярджае: «Ніякага вадаспаду тут не атрымалася»! Наконт-жа іншых заўваг, што ў вершы быццам «выдумана яшчэ нейкая «ніштаватая вышыня», «дзівосы дзіўныя» і г. д.»,—то зноў давядзецца змоўчыць, бо аўтар ліста кепска арыентуецца «ў цемры філалогіі», калі не горшая бяда ў яго: проста не хоча як след ведаць і вывучаць мову сваіх бацькоў.

Хочацца сказаць т. Вераб'ю яшчэ аб тым, што ён часта ў крытычным запале не абдумвае свае сцвярджэнні. Вядома, і рабіна можа расці кустам, як і вішня, «Куст, кусцік, кусток, кусточак...—тлумачыць Уладзімір Даль,—усякая многаствола, нізкая расліна, шматтаддовая расліна з цвяравяністым ствалом, маларослае дрэва». Менавіта так у гарах, на глыбах мармуру і граніту, расце рабіна, ды не толькі ў гарах, бывае, расце гэтак і на збочынах дарог і ў палісадах Чэрвеньшчыны.

Аўтар пісьма, відаць, няўважліва чытаў тэкст. Ён сцвярджае, што ў вершы «Радкі мае» паэт «яўна не лічыцца з сваёй творчасцю. Уласныя аднатомнікі ён называе бяздомнікамі». А ўспамінаюцца там аднатомнікі іншых паэтаў. І яшчэ: ён аб'ядноўвае ў адзін два вершы—«Роздум» і «Стукну-грукну ў дзверы сенечныя», прычым, відаць, наўмысля робіць перыфраз у першым радку другога верша, выкідвае з сярэдзіны цытаты некалькі радкоў і зноў-жа галаслоўна сцвярджае, што «верш «Роздум» зусім незразумелы чытачу», бо «тут напісана: «Стукну-грукну ў дзверы сонечныя» і г. д.

А верш «Стукну-грукну ў дзверы сенечныя», на маю думку, выдатны па свайму рытмічнаму малюнку. У гэтым вершы незвычайнае багацце рытмаў.

Стукну-грукну ў дзверы сенечныя:
— Добры дзень!
— Добры дзень.
Нідзе не дзенешся,
Стала ў цень.
Вусны сціснуты дзяўчыніны.
Дзверы ў хату не адчынены.
І гаворкі больш няма...

Дарэмныя спадзяванні, няўдалае заляцанне, прапаў ты, хлопец! Не, не прапаў. Ён мае гонар, ведае сабе цану, і сэрца яго супакойваецца ў палоне задуменнай, аснежанай далечы: «Я паеду, але скрыпу палазоў не забудзеш ты да самых маразоў»...

Перад тым як паставіць кропку, мне ўсё-ж хочацца пажадаць таварышу Вераб'ю, каб ён выхоўваў свае густы, вучыўся разумець не толькі паэзію; да ўсяго добрага, высакароднага, прыгожага ў нашым жыцці ставіўся ўважліва і шчыра.

Анатоль ВЯЛЮГІН.

Вобразы нашых сучасніц

Мастакі-рэалісты ўсіх эпох стварылі яркія вобразы сваіх сучасніц. Як жывыя, глядзяць на нас з карцін Тыцыяна, Рэмбрандта, Гойі, Кіпрэнскага і Серова цудоўныя жаночыя вобразы.

Совецкая жанчына-працаўніца натхніла многіх совецкіх мастакоў на стварэнне хвалюючых вобразаў, якія знайшлі асабліва яркае аллюстраванне ў карцінах «Маці» Б. Неменскага, «Раніца» С. Чуйкова, «Партрэт Героя Сацыялістычнай Працы Хобты» скульптара А. Кавалёва, «Партызанка» О. Супрун, «На прыёме» І. Шэвандронавай і ў многіх іншых.

Знайшоў сваё аллюстраванне вобраз совецкай жанчыны і ў творчасці мастакоў Беларусі. Тыповы вобраз партызанкі стварыў А. Шыбнёў у карціне «Палонных вядуць». Глядзіш на дзяўчыну-франтавіка ў карціне Р. Кудрэвіч «У родны калгас», і ўспамінаюцца многія совецкія дзяўчаты, якія самаадана і мужна змагаліся за свабоду Радзімы ў гады Айчыннай вайны. Простая шапка-вушанка, нязграбны кажух, цяжкія боты, грубае салдацкае адзенне толькі падкрэсліваюць пяшчотнасць твару, яго прывабныя рысы, цёмныя з усмешкай вочы, высокі, ясны лоб, акаймаваны мяккімі валасамі. Верыш у тое, што гэтая простая совецкая дзяўчына магла ратаваць жыццё байцоў, раненых у баях; уяўляеш, як, не змыкаючы вачэй, на начным дзяжурстве ў шпіталі гаіла яна раны совецкіх воінаў.

Асветлены радасцю сустрэчы твары маладых калгасніц, якія крочаць побач з дзяўчынай. Хораша паказана і яе сястра, чорнавалосая, у клетчатай хустцы і кароткім кажушку, і яе сяброўка, якая трымае светлажоўтую хустку з махрамі, павярнуўшы галаву ў бок франтавічкі. Пяшчота і гонар за дачку свецяцца ў вачах старога бацькі, які распрагае каня; клапатліва здымае з саней рэчы маці; хлапчук-брат з насцярожанай увагай слухае размову дзяўчат. Цеплыня сустрэчы падкрэсліваецца мяккімі фарбамі зімовага дня, утульнасцю вясковай вуліцы.

Усё гэта Р. Кудрэвіч перадае проста і натуральна. Карціна «У родны калгас» кранае, хвалюе і выклікае пачуццё глыбокай сімпатыі да гэтых мілых дзяўчат, працаўніц калгаснай вёскі.

Цяпер Р. Кудрэвіч працуе над новай кампазіцыяй, прысвечанай сельскім дзяўчатам.

Рысы перадавой жанчыны аллюстраваны ў «Партрэце свінаркі Чарняўскай» Я. Зайцава.

Гаспадарская дзелавітасць, дбайнасць калгасніц перадаецца ў карціне К. Касмачова «На калгаснай пасецы». Тут ёсць характэрны вобраз жанчыны, якая глядзіць у бок расчыненага вакна, праз якое пачаляр з салу падае з вулляў соты. Спакойныя і стрыманыя рухі трох жанчын, яны ўмела, з увагай займаюцца сваёй справай. Натуральнай кампазіцыяй, выразнымі фарбамі ўзнаўляе мастак эпізод радаснага і заможнага жыцця калгаснай вёскі.

Адным значных твораў, прысвечаных жанчыне-работніцы, у беларускіх жывапісцаў вельмі мала.

Ёсць станоўчыя якасці ў «Партрэце Галі Чарняк, стаханаўкі-закройшчыцы фабрыкі імя Кагановіча» Я. Красоўскага. Галя паказана ў працэсе працы. У стракатай лёгкай сукенцы і белым фартуху, яна ўпэўнена кіруе станком. Мастак імкнуўся перадаць яе ўважлівы погляд, заклапочанасць. І ўсё-ж сапраўднага характэра ў гэтым вобразе мала. Невыразны малюнак, вочы стаханаўкі цьмяныя, не відаць у іх таго ўнутранага святла, якое нават і непрыгожы твар робіць прывабным, калі чалавек захоплены любімай працай. Фігуры жанчын на заднім плане партрэта намаляваны неахайна, не ўзбагачаюць кампазіцыю, а перашкаджаюць успрыймаць цэнтральны вобраз. Да сапраўднага мастацкага абагульнення Я. Красоўскі ў гэтай рабоце яшчэ не ўзняўся. Няма яго і ў карціне Х. Ліўшыца «На тонкасуконным камбінаце», дзе жанчына-работніца намалявана даволі абыякава, пратакольна.

Вобраз беларускай жанчыны, перадавой работніцы-стаханаўкі чавае яшчэ свайго ўвасаблення.

Неаднаразова звяртаюцца мастакі Беларусі да вобраза артысткі. І тут ёсць партрэты, якія надоўга застаюцца ў памяці.

Унутраны свет таленавітай балерыны трапна раскрывае І. Ахрэмчык у «Партрэце народнай артысткі БССР Васільевай». Глядач бачыць задумённыя вочы, напружаныя бровы, завіткі кароткіх валасоў, якія вяночкам акаймоўваюць крыху схіленую набок галаву, чорны капялюшык з выгнутымі палямі, а на губах — ледзьледзь улоўная ўсмешка. Характарыстыку артысткі дапаўняюць пяшчотныя, хударлявыя рукі з тонкімі пальцамі; так і ўяўляеш, як пластычна і зграбна выгінаюцца яны ў танцы. Чорная строгая сукенка падкрэслівае белізну твару. Мастак стварыў адухоўлены вобраз артысткі.

Балерыну іншага характару і тэмпераменту намаляваў Я. Зайцаў у «Партрэце народнай артысткі БССР Нікалаевай». Бліскучыя чорныя вочы з густымі вейкамі і рэзка выгнутымі бровамі ажыўляюць яе хударлявы твар. У позе выражана парывістасць, рухавасць і сабранасць. Чорныя да плячэй валасы, вялікія завушніцы-кольцы, эфектны тэатральны касцюм падкрэсліваюць своеасаблівасць твару артысткі. Нажаль, не закончаны ў партрэце рукі, асабліва эскізная правая рука.

Запамінаецца «Партрэт заслужанага дзеяча мастацтва БССР Лапаціной» работы А. Шэўчэнкі. Лапаціна сядзіць за сталом, пакрытым белым абрусам, нібы задумаўшыся пасля гутаркі з дзяўчынкай, якая сядзіць тут-жа. Задумлівыя, строгія вочы, простая прычоска, вышытая народным арнаментам сукенка — усё тут спрыяе ўвасабленню вобраза мудрай жанчыны з народа. Шкада толькі, што разбелены тон фона і абруса некалькі зніжае выразнасць партрэта, надаючы яму вяласць.

А. Забораў напісаў «Партрэт заслужанай артысткі БССР Гусельнікавай» і «Партрэт народнай артысткі БССР Жданові́ч». На першым партрэце спявачка, а на другім — драматычная артыстка. Аднак у кампазіцыі партрэтаў гэта, нажаль, не выяўлена.

У партрэце Н. Гусельнікавай мастак перадаў рысы маладой прыгожай жанчыны, але глыбокі вобраз таленавітай спявачкі не атрымаўся. Перад намі проста жаночы партрэт. І сонечнае святло не дапамагло аўтару раскрыць унутраны свет артысткі, таму што на першым плане ярка асветлены белы капялюш і пальчаткі. Кампазіцыя партрэтаў мала выразная. Вобразы совецкіх таленавітых артыстак патрабуюць больш глыбокага ўвасаблення.

Серыю скульптурных партрэтаў жанчын—Герояў Сацыялістычнай Працы, сярод якіх вылучаюцца сваёй манументальнасцю бюсты Кухаравай і Шкурко, стварыў З. Азгур.

У выяўленчым мастацтве Беларусі няма твора, у якім была-б глыбока аллюстравана высакародная праца совецкай жанчыны-настаўніцы, урача. А тэма мацярынства?

З. Азгур звярнуўся да гэтай па сутнасці забытай тэмы, якая знайшла выяўленне ў яго скульптуры «Калыханка». Скульптар паказаў, як маладая маці, калышучы сына, спявае песню, поўную мараў аб яго будучыні. У яе твары, у выразе вачэй, свабоднай позе зграбнай фігуры аўтар імкнуўся перадаць адчуванне здароўя, шчасця, радасці жыцця. Праўда, усё гэта вынікае не столькі з глыбіні вобраза, колькі прыносіцца звонку. Глыбокай псіхалагічнай характарыстыкі ўсё-ж не атрымалася. Ды і пластычнае вырашэнне скульптуры даволі аднастайнае і не зусім адпавядае тонкасці, задушэўнасці вобраза.

Поўны лірызма і прывабнасці вобраз стварыў С. Адашкевіч у кампазіцыі «За мір». Аўтар паказаў маладую жанчыну, якая вышывае дарагія ўсім людзям словы «Мір пераможа вайну». На партрэце пяшчотныя рысы твару, погляд, крыху летуценны, мяккія валасы, зачасаныя назад. Адухоўленасць вобраза падкрэсліваецца лёгкай светаценню, адсутнасцю рэзкіх кантрастаў. Кампазіцыя скульптуры «За мір» вабіць сваёй натуральнасцю і непасрэднасцю.

Тая-ж натуральнасць і жыццёвасць характэрна для «Партрэта дзяўчыны» І. Ахрэмчыка. Ён знаёміць з светлавалосай беларускай дзяўчынай з крыху прыжмуранымі вачыма і прывабным тварам. Дзяўчына вабіць добрадушнасцю, жывасцю, розумам.

Стваральнікі карцін і партрэты, прысвечаныя жанчыне-сучасніцы, нашы мастакі ўзбагачаюць мастацтва соцыялістычнага рэалізма.

Ф. ЛЕЙТМАН.



На здымку: дэлегат XIX з'езду Комуністычнай партыі Совецкага Саюза токар Мінскага трактарнага завода К. Курчыцкая. Партрэт работы мастака В. Сухаверхава.

НА КАНЦЭРЦЕ РУСКАГА НАРОДНАГА АРКЕСТРА

З вялікім поспехам прайшлі ў Мінску канцэрты рускага народнага аркестра імя Н. Осіпава.

Першы, хто звярнуў увагу на мастацкія асаблівасці рускіх музычных інструментаў, быў таленавіты рускі музыкант В. Андрэеў, які прысвяціў усё сваё жыццё ўдасканаленню і шырокаму распаўсюджванню самабытных рускіх музычных інструментаў. Ужо ў 1888 годзе ён стварае першы балалаечны аркестр, а праз некалькі год гэты аркестр уключыў і іншыя рускія інструменты—гуслі, жалейкі, дудкі. Аркестр з вялікім поспехам выступаў у Расіі і за граніцай.

Многія рускія кампазітары з вялікай любоўю адносіліся да народных інструментаў і выкарыстоўвалі іх у сваіх оперных і іншых творах.

У наш час пачынанне В. Андрэева набыло шырокі размах — на народных інструментах граюць, народныя аркестры стварэюцца ва ўсіх кутках Расійскай Федэрацыі. Гэты рух зрабіў вялікі ўплыў і на многія нацыянальныя рэспублікі, дзе створаны свае аркестры.

Лепшыя традыцыі рускай народнай інструментальнай музыкі захоўваюць і далей развіваюць выдатныя калектывы — аркестр імя В. Андрэева ў Ленінградзе і аркестр імя Н. Осіпава ў Маскве. Таленавіты музыкант і віртуоз-балалаечнік Нікалай Осіпаў узняў выканаўча-мастацкія якасці аркестра на вышэйшую ступень. Цяпер калектыў з лёгкасцю выконвае самыя складаныя творы класічнай і савецкай музыкі. Характэрнымі рысамі выканаўчага майстэрства гэтага аркестра з'яўляецца віртуозная тэхніка музыкантаў, злітнасць ансамбля, цудоўная піяно, лёгкая паслухмянасць і выкананне дырыжорскіх задум. У гэтым вялікая заслуга яго мастацкага кіраўніка — заслужанага артыста РСФСР В. Смірнова і дырыжораў Гнутава і С. Калабкова.

З праграмы, выкананай у Мінску, вялікае ўражанне пакінуў музычны малюнак «Былое на Волзе» Кулікава. Перад слухачом узнікае малюнак ціхай раніцы. Спакойна цячэ шырокая і магутная рака, прачынаюцца людзі, пачынаецца цяжкая праца бурлакоў. Гэта ўсё перадаецца спачатку патроху, урыўкамі, а затым больш шырокімі папеўкамі вядомай бурлацкай песні «Эй, ухнем!». Праходзіць дзень і зноў вечар, і спакойная, велічная Волга нясе свае воды ў далячынь...

Аркестр з высокім майстэрствам выконвае гэты твор.

Вельмі прыемнае ўражанне пакінула фантазія на дзве беларускія тэмы кампазітара Гарадоўскай. І кампазітар і аркестр тонка адчулі нацыянальныя асаблівасці беларускіх народных песень, бо і гарманічная мова і распрацоўка тэм, аркестроўка і само выкананне стварылі яркі, каларытны беларускі пейзаж з святочным настроем.

Творы Н. Будашкіна для гэтага аркестра сталі арганічнай неабходнасцю. Неяк ужо не мысліцца канцэрт аркестра без таленавітай, запамінальнай музыкі гэтага выдатнага савецкага кампазітара. Саліст В. Шманёў лёгка выканаў яго папулярны канцэрт для домры з аркестрам.

Асабліва каларытна прагучалі ў аркестры творы класічнай музыкі—«Вальс-фантазія», кракавяк з оперы «Іван Сусанін», танец маленькіх лебедзеў з балету «Лебядзінае возера». Буру апладысментаў выклікала выкананне «Палёта чмяля» з оперы «Казка пра цара Салтана». Вось дзе было паказана сапраўднае майстэрства і дамрыстаў і балалаечнікаў—усіх разам і кожнага паасобку, бо для выканання гэтага твора патрабуецца і віртуозная тэхніка музыкантаў і роўны ансамбль. Усё гэта было зроблена артыстычна і на вельмі высокім узроўні.

Упрыгожыў канцэрт унісон балалаечнікаў, які выканаў з аркестрам «Камарынскую» ў апрацоўцы Н. Осіпава. Гэта п'еса тыпова руская, віртуозная. Нажаль, такіх твораў у праграме мала. А хацелася-б пачуць віртуознае сольнае выкананне з аркестрам і на дудцы (свірэль), і на рускім гармоніку і інш. Такія аркестры ў сваёй праграме павінны мець і класічную музыку і народную.

Праграму канцэрта значна дапоўнілі салісты-вакалісты. Салістка Маскоўскай філармоніі В. Іванова з асаблівай цеплынёй спявала рускія народныя песні і песні савецкіх кампазітараў. Незабыўнае ўражанне пакінула песня Салаўёва-Сядога «Камышы», выкананне якой адзначалася артыстычнасцю і поўным, даходлівым раскрыццём яе зместу. Саліст Вялікага тэатра оперы і балету СССР А. Огніўцэў з глыбінёй пачуцця выконваў рускія народныя песні і класічныя арыі. Артыстызмам, пранікнёнасцю напоўнены былі і персідская песня Рубінштэйна, і апавяданне старога цыгана з оперы «Алеко» Рахманінова, і «Ноч асенняя» Глінкі.

Шкада, што ў рэпертуары выдатнага выканаўцы адсутнічалі песні другога плана — жартоўныя, гераічныя.

Аркестр быў дастойным партнёрам спевакоў. Тонкае адчуванне намераў салістаў, адзіны ансамбль з імі стварылі цэльнае ўражанне ад кожнага нумару. У гэтым заслуга дырыжора С. Калабкова.

Існаванне і работа выдатнага калектыву Рускага народнага аркестра імя Н. Осіпава, яго высокае майстэрства, шырокі рэпертуар даюць добры прыклад, дастойны пераймання другімі нацыянальным аркестрам, у тым ліку і нашым Беларускім народным аркестрам.

Іосіф ЖЫНОВІЧ,
народны артыст БССР, мастацкі кіраўнік Беларускага народнага аркестра.

На здымку: выступленне Дзяржаўнага рускага народнага аркестра імя Н. Осіпава на сцэне Мінскага акруговага Дома афіцэраў. Дырыжор—Сяргей Калабкоў, салістка Вікторыя Іванова.

Фото І. Салавейчыка.

Энтузіясты культурнай работы

Яе паважаюць калгаснікі

У калгаснай вёсцы Дзяляцічы Новагрудскага раёна ў невялікім, але прыгожа афармленым пакоі размясцілася мясцовая бібліятэка. Мы зайшлі сюды якраз тады, калі загадчыца Лідзія Бушма выдавала кнігі.

— Што-небудзь новае, цікавае, — прасіў сівы дзядуля, уважліва прыглядаючыся прыжмуранымі вачыма да кніг на паліцах.

Лідзе, відаць, было цяжка прапанаваць што-небудзь новае. Дзед Іван Андрэевіч Шунько перачытаў ужо амаль усе кнігі бібліятэкі. Вось «Вачыма друга» Янкі Брыля — гэтым дзядуля, мабыць, зацікавіцца.

— Пра Польшчу, кажаш? Запісвай, запісвай, дачушка, гэта цікава... Пачытаю, як там цяпер просты народ жыве, бо раней, за пілсудчынай, не толькі нашаму мужыку-беларусу было нясоладка, але і польскі народ гараваў.

На паспела Ліда абмяняць кнігі яшчэ некалькім чытачам, як у бібліятэку весела прыбеглі хлапчукі. Гэта вучні мясцовай школы. Яны таксама прыйшлі абмяняць кнігі.

У калгасе каля 400 дамоў, і ў кожным з іх ёсць чытачы.

Лідзіі Бушма часта прыпамінаецца пачатак яе працы ў Дзяляцічах. Увосень 1950 года прыехала працаваць бібліятэкаркай у гэтую вёску. Ведала Ліда, што людзі тут добрыя і разгон для працы вялікі.

— Пакой для бібліятэкі быў цесны, — расказвае яна,—а кніг, памятаю, усяго 260. Чытачоў стала прыходзіць многа, а задаволіць усіх літаратурай не было ніякай магчымасці. Загадчык клуба Віктар Шарэцкі аж дзівіўся. Ніколі, кажа, такога не было. Пакой хоць і малы, але калі навяла ў ім парадак, дык і зайсці сюды было прыемна. — Тры зімы хадзіла Лідзія ў вячэрнюю школу за пяць кілометраў, цяжка было, але дзесяты клас яна скончыла паспяхова.

Былы старшыня мясцовага калгаса тав. Трубка нават і слухаць не хацеў, каб дапамагчы чым-небудзь бібліятэцы. Толькі калі старшынёй калгаса выбралі Кастуся Саўчанку, пачалі штогод выдзяляць з калгасных даходаў сродкі ў культфонд.

За апошнія гады ўзбагацеў калгас. З ростам заможнасці калгаснікаў павысіліся і іх культурныя запатрабаванні. Вечарамі ў клуб прыходзяць паглядзець канцэрт сваіх самадзейных артыстаў, а ў бібліятэцы збіраюцца заўзятыя чытачы. Гэта калгаснікі, інтэлігенцыя, рабочыя-сплаўшчыкі. Пры іх дапамозе і ўдзеле Лідзія праводзіць абмеркаванне твораў мастацкай літаратуры, арганізоўвае літаратурныя вечары. Калі нядаўна было аб'яўлена аб правядзенні канферэнцыі чытачоў па аповесці «У Забалоцці днее» Я. Брыля, аказалася, што гэтую кнігу чыталі вельмі многія.

Настаўніца Т. Хількевіч, калгаснікі Я. Мамчыц, А. Грос, старшыня калгаса К. Саўчанка, выступаючы на канферэнцыі, параўналі падзеі, апісаныя ў кнізе, з тымі, што перажыла іхняя вёска ў той-жа перыяд. У апошні час бібліятэка правяла літаратурныя вечары па творчасці пісьменнікаў З. Бядулі і В. Ланіса, а цяпер сумесна з настаўнікамі сямігадовай школы рыхтуе канферэнцыю чытачоў па кнізе «Педагагічная паэма» А. Макарэнкі.

Не забывае бібліятэкарка і аб калгасніках аддаленых брыгад. Праз комсамольцаў Івана Шмыка і Генадзія Ціхановіча ў вёсках Хадасы і Воўкаразь яна арганізавала бібліятэкі-перасоўкі, а на хутары Набяржнае кнігі дастаўляюць вучні Сямён Наско і Леанід Валуевіч. Добрую бібліятэку сельскагаспадарчай і мастацкай літаратуры стварыла Лідзія ў чырвоным кутку на жывёлагадоўчай ферме. Ёю карыстаюцца многія жывёлаводы. Лідзія Бушма спявае ў хоры, іграе ў аркестры народных інструментаў. Дарэчы, немалую заслугу мае яна ў стварэнні калгаснай харавой капелы. Калі самадзейны калектыў не меў свайго пастаяннага мастацкага кіраўніка, гэтую ролю выконвала бібліятэкарка.

Настойлівы, ініцыятыўны, самаадданы арганізатар культурна-асветнай работы — такой ведаюць комсамолку Лідзію Бушма ў калгасе «Сцяг Савецкі».

Н. ВАСІЛЕЎСКІ.

Сёстры Флёркавы

— Выступаюць сёстры Фёдаравы... прабачце, выступаюць нашы спявачкі сёстры Флёркавы! — гэты просты, не надта арыгінальны жарт канферанс'е— загадчыка клуба саўгаса «10 год БССР» Мікалая Буранава быў сустрэты гучнымі воплескамі. Адчувалася, што апладысменты не былі данінай звычайнай ветлівасці слухачоў да артыстаў; гэта былі гарачыя, радасныя воплескі, якія ішлі ад душы.

І вось са сцэны ў насцярожаную цішыню прасторнай залы, запоўненай знатнымі даяркамі і праслаўленымі хлебаробамі, ліецца ціхая, ласкавая мелодыя. Перад слухачамі ўзнікаюць малюнкі шырокіх прасторaў Радзімы з яе неабсяжнымі нівамі залатога збожжа, над якім лунае радасная песня шчаслівых жней. І хаця за вокнамі сцюжа, сэрца адчувае цеплыню гарачага летняга дня, калі так прыемна прагнаць смагу сцюдзёнай вадой...

Гэта «тры сястрычкі», як ласкава называюць у саўгасе трох сясцёр Флёркавых — Надзю, Аўгінню і Марыю, — спяваюць народную песню «За гарою каля студні».

Першай у самадзейнасць прыйшла старэйшая — Надзя, следам за ёй — Аўгіння, а вось нядаўна на клубнай сцэне мы ўбачылі іх малодшую сястру — адзінаццацігадовую Марусю. Надзіва прыемным голасам праспявала яна папулярную песню «Валенкі». Хто ведае, можа імёны гэтых трох спявачак— удзельніц сельскай мастацкай самадзейнасці сясцёр Флёркавых — стануць шырока вядомы, як вядомы сёння імёны сясцёр Фёдаравых: шлях апошніх у мастацтва ляжаў таксама праз самадзейнасць.

Цяпер сёстры, як і ўвесь шматлікі калектыў мастацкай самадзейнасці саўгаса «10 год БССР», рыхтуюцца да фестывалю. Яны ўдзельнічаюць у рабоце хору, рыхтуюць песні для сольнага выканання. Ды не толькі сёстры. Часам можна пачуць, як усёй сям'ёй — бацька, маці і тры дачкі— задушэўна спяваюць народныя песні. Праўда, пакуль яшчэ дома. Чакаем іх усіх на клубнай сцэне.

А. ВЕРАМЕЙЧЫК.

Любанскі раён.

З замежнай пошты

„Выратавальнік" белага чалавецтва

Мы з вамі, дарагі чытач, спакойна сядзім і нават не ведаем, што ёсць мужчы чалавек, які заняты нашым выратаваннем. Нарадзіўся гэты чалавек у штаце Місісіпі (ЗША), але дзейнасць яго праходзіць у асноўным у штаце Алабама, а таксама ў некаторых іншых суседніх поўднёвых штатах. Завуць гэтага чалавека Ас Картэр. Ён выступае з палкімі прамовамі, і ў яго ёсць прыхільнікі, якія арганізоўваюцца ў асобныя атрады «барацьбы за белага чалавека». Адзін з гэтых прыхільнікаў (нейкі Лютэр Кінг) выдаў нават біяграфію Аса Картэра, якая так і называецца «Ас Картэр — выратавальнік белага чалавецтва». З гэтай біяграфіі мы даведваемся, што Ас Картэр з дзіцячых год праяўляў выключныя адольнасці, і ўжо на школьнай лаўцы яму прыйшла ў галаву ідэя аб тым, што беламу чалавецтву пагражае пагібель. Ад каго?—спытаеце вы. На Усходзе — ад манголаў, а ў Амерыцы, вядома, ад неграў.

І вось «выратавальнік» белага чалавецтва пачаў ездзіць па розных гарадах поўднёвых штатаў з дакладамі і лекцыямі, у якіх заклікаў неадкладна распачаць барацьбу за «выратаванне» белых людзей.

Ідэалогія праслаўленага «выратавальніка» не вызначаецца навізной або арыгінальнасцю. Гэта даўно ўсім вядомы расізм, прыпраўлены нейкай доляй містыцызма. Расізм, вядома, для поўднёвых штатаў не навіна, але Ас Картэр і яго сябры прапаведуюць расізм у яго крайніх формах. Іх ужо не задавальняе нават дзейнасць Ку-Клукс-Клана, гэтай адкрытай чорнасоценнай арганізацыі. Што там шэсце ў масках, запаленыя кастры перад негрыцянскімі дамамі, нават «саматужныя» суды Лінча! Усё гэта, з пункту гледжання Аса Картэра, «дзіцячая гульня». Для барацьбы з неграмі ён прапануе ўжываць больш страшныя сродкі — выбуховыя рэчывы, дынаміт, бомбы. Расправа з адным неграм зусім не задавальняе нашага ваяўнічага джэнтльмена. Ён патрабуе калектыўнага вынішчэння неграў, патрабуе тэрору. Не задавальняюць яго і нядаўнія да некаторай ступені ліберальныя рашэнні вярхоўнага суда ЗША аб адмене асобных абмежаванняў для неграў, у школах і на транспарце. Даведаўшыся пра іх, Ас Картэр пагражаў тым, што, маўляў, поўднёвыя штаты могуць аддзяліцца, арганізаваць асобную рабаўласніцкую дзяржаву.

Ніхто, вядома, да гэтых пагроз сур'ёзна не ставіўся, і «выратавальніка» белага чалавецтва нават параўноўвалі з нейкім Джонам Кердам. Быў у 80-х гадах мінулага стагоддзя такі дзівак у Бастоне, які нечакана аб'явіў сябе «імператарам Амерыкі». Нованяўленага імператара доўга ніхто не чапаў. Ён і яго пераемнікі крыўляліся некалькі год, а потым прыйшлося іх пасадзіць у вар'яцкі дом.

Між тым Ас Картэр фігура куды больш шкодная, чым гэты аперэтачны імператар.

Сам па сабе Ас Картэр, вядома, нікчэмнасць, і пра яго не варта было-б і гаварыць, калі-б не тыя тэндэнцыі, якія характэрны для новых прыёмаў дзейнасці поўднёваамерыканскіх чорнасоценцаў. Мы не бярэмся сцвярджаць, што імённа пад непасрэдным уздзеяннем шумлівай прапаганды Картэра з'явіліся ў поўднёвых штатах новыя дынамітчыкі, якія ўжываюць бомбы і дынаміт у сваёй барацьбе з неграмі. Гэта, вядома, новыя моманты, уласцівыя наогул цяперашнему [illegible] грыцянскаму тэрору ў Злучаных Штатах Амерыкі. Ці проста тут удзе[illegible] «выратавальніка», ці ён ужо выкарыс[illegible] чужы вопыт, вырашаць не бярэмся. [illegible] ва ўсякім выпадку поўднёваамерыканскія расісты пад уплывам надаўніх [illegible] народных падзей перайшлі да масавага тэрору, да якога істэрычна заклікаў [illegible] сваіх лекцыях і дакладах «выратавальнік белага чалавецтва».

Як вядома, XVI з'езд Камуністычнай партыі ЗША накіраваў тэлеграму [illegible] зідэнту, у якой гаворыцца: «Бомбы [illegible] даюць у штаце Алабама, а не на Блізкім Усходзе, пагроза амерыканскай дэмакратыі знаходзіцца не за пяць тысяч міль ад Амерыкі, яна ў самой краіне». У тэлеграме гаворыцца аб тым, што [illegible] стыцыя ЗША парушаецца невялікай меншасцю поўднёвых белых хуліганаў. Гэта работа саратнікаў, а магчыма і прыхільнікаў «выратавальніка».

Бомбы сапраўды падаюць у штаце Алабама. Нядаўна ў гэтым штаце ў горадзе Монтгомеры былі разбураны бомбамі чатыры негрыцянскія царквы розных [illegible] вызнанняў. Гэта вельмі трапная ілюстрацыя да ўсіх дэкларацый аб свабодзе [illegible] лігіі, якая нібы парушаецца ў краінах [illegible] роднай дэмакратыі і Совецкім Саюзе! [illegible] вось негрыцянскі пастар Рожа Дзес[illegible] штата Тэхас гаворыць аб тым, што [illegible] прыхаджане пасля ўсіх эпізодаў у [illegible] це Алабама баяцца хадзіць у царк[illegible] Дарэчы сказаць, пры ўзрывах [illegible] цэркваў былі ахвяры і сярод прыхаджан і сярод духавенства.

Між іншым, не толькі негрыцянскі[illegible] цэрквы прыцягваюць увагу белых хуліганаў. Яны аб'явілі «бойку за аўтобус», нібы гэтая бойка ўжо выйграна. У тым жа штаце Алабама ўсе аўтобусы, [illegible] ездзяць негры, разбіваюцца невялікі[illegible] бомбамі ручнога вырабу, і ніхто за гэ[illegible] не адказвае.

Усе гэтыя ўмовы ствараюць, вядома, [illegible] абмежаваныя магчымасці для дзейнасці такіх малойчыкаў, як Ас Картэр і [illegible] шматлікія прыхільнікі. Нездарма [illegible] карэспандэнт газеты «Нью-Йорк тайм[illegible]» са штата Алабама піша пра тое, што [illegible] «тэрарызаваны не толькі негры і каляровыя, тэрарызаваны і белыя, якія чо[illegible] жывуць побач з каляровымі, а бомбы і дынаміт не разбіраюць колеру скуры». Бо[illegible] як «выратоўваюць» белае чалавецтва і Картэр і яго сябры.

Выдатны негрыцянскі дзеяч, старшы[illegible] буржуазнай асацыяцыі па развіцці [illegible] ты сярод каляровых, Рой Вількінс нядаўна напісаў:

«Прэзідэнт Эйзенхаўэр, які вельмі [illegible] чуе і цікавіцца непрыемнасцямі [illegible] граў, застаецца безудзельным, калі [illegible] суайчыннікі пазбаўлены ўсялякіх праў.

«Цэрквы чорных, — гаворыць ён [illegible] лей, — бамбардзіруюцца, чорныя [illegible] шчэннікі арыштоўваюцца, многія сем'і [illegible] каюць з гарадоў, каб выратаваць [illegible] жыццё. І што-ж мы чуем, калі гаворы[illegible] пра ўсё гэта. Толькі адцягненыя [illegible] спачування. Але яны настолькі нек[illegible] крытныя, што не здольны ніяк удзей[illegible] чаць на натхняльнікаў забойстваў і тэ[illegible] ту».

«Выратавальнікі» белага чалавецтва [illegible] чуваюць сябе ў гэтых абставінах, як рыба ў вадзе.

Прароцтва Талейрана

«Сэрца Талейрана» — так называецца кніга, выпушчаная французскім гісторыкам Жулем Мішо. Самая цікавая частка гэтай кнігі — арыгінальныя дзённікі Талейрана, якія адносяцца да апошніх год яго жыцця. Яны былі старанна зашыфраваны і знаходзіліся ў прыватных асоб. Расшыфроўка гэтых дзённікаў, напісаных асобным шыфрам, прыдуманым вядомым дыпламатам, патрабавала некалькі год і была справай вельмі складанай. Нездарма Талейран пісаў, што спадзяецца, што яго інтымныя запіскі не ўбачаць свету. Ён памыліўся. Запіскі, нарэшце, убачылі свет, праўда, толькі праз 118 год пасля [illegible] смерці. У гэтых дзённіках ёсць рад [illegible] вых запісаў, якія адносяцца да палітычнага жыцця 30-х гадоў мінулага стагоддзя. Але не пра іх ідзе цяпер гаворка. [illegible] спынімся толькі на некаторых запісах Талейрана, якія выклікалі асаблівую цікавасць і названы некаторымі органамі французскага друку «прароцтвам Талейрана». Як гэта ні дзіўна, асобныя нататкі Талейрана ўяўляюць цікавасць у святле сённяшніх падзей, звязаных з Суэцкім каналам і з барацьбой народаў Афрыкі за сваё вызваленне.

Калі памёр Талейран (у 1838 г.), Суэцкага канала яшчэ не было. Але неадоўга да яго смерці ўзніклі першыя праекты [illegible] тага канала. З гэтай прычыны вядомы дыпламат запісаў свае цікавыя думкі.

«Усё больш упарта, — пісаў Талейран» (запіс, як відаць, адносіцца да 1836 года)— распрацоўваюцца праекты аб злучэнні [illegible] наламі мораў, якія абмываюць чорны [illegible] тынент. Часта гавораць аб тым, што [illegible] нашы дзеці будуць сведкамі гэтых [illegible] ных цудаў. Гэтыя грандыёзныя творы [illegible] лавечага розуму міжволі прымушаюць [illegible] бываюцца аб той небяспецы, якую яны [illegible] суць. Мне здаецца, што яны могуць [illegible] ваць прэстыж людзей белай расы. Будучыя заваяванні Афрыкі толькі тады [illegible] нясуць карысць, калі людзі чорнай расы [illegible] дуць слепа падпарадкоўвацца белым [illegible] падарам. Калі яны міжволі стануць [illegible] камі і ўдзельнікамі грандыёзных тэхнічных пераўтварэнняў, калі тэхніка хоць-бы [illegible] сткова пяройдзе ў іх рукі, калі яны пас[illegible] пова далучацца да культуры, выключны [illegible] становішча і прэстыж еўрапейцаў будуць [illegible] падарваны. Я не ведаю, да чаго гэта [illegible] рэшце прывядзе, але ва ўсякім выпадку [illegible] настане такі момант, калі Еўропа ўжо [illegible] будзе палітычным цэнтрам свету; народы Усходу могуць абудзіцца ад спрадвечнага спячкі; народы Афрыкі далучацца да культуры, і тады еўрапейцы страцяць усе свае выключныя правы, якія дазваляюць ім [illegible] рымліваць перамогі над далёкім, нешчаслівым светам. Увогуле наша цывілізацыя — зброя вострая з двух бакоў, якая патрэбна ўмець карыстаць».

Гэты запіс Талейрана адносіцца да [illegible] мага раняга часу каланіялізма, да таго часу, калі толькі пачыналіся стварацца каланіяльныя ўладанні еўрапейскіх дзяржаў у Афрыцы. Адначасова з гэтым узнікі першыя, тады амаль фантастычныя праекты каналаў, якія перасякаюць афрыканскія пустыні. Вядомы французскі дыпламат многа год назад зразумеў тое, што [illegible] бадай, не заўсёды да гэтага часу разумеюць некаторыя палітычныя дзеячы буржуазных краін. Ён лічыў, што каланіяльная палітыка з'яўляецца небяспечнай зброяй вострай з двух бакоў.

І цяпер, калі ад каланіяльнага рабства вызваляюцца многія народы Усходу, у тым ліку і народы Афрыкі, гэтыя нататкі вялікага дыпламата сапраўды ўяўляюць вялікую цікавасць: нездарма іх называюць «прароцтвам».

Е. САЛАТЕЎ.

Ганебныя з'явы

Аб кніжным гандлі ў Мазыры

Прыгожы і ўтульны горад Мазыр. Прыемна прайсціся па яго вуліцах. Яны то падымаюцца на маляўнічыя ўзгоркі, то спускаюцца да ціхай ракі.

Але, можа, самае найлепшае — ўзабрацца на крутую Шайтан-гару. Кажуць, што яна насыпана рукамі шматлікіх верных памочнікаў і саратнікаў у гонар аднаго з народных важакоў-паўстанцаў, празванага так за сваю хітрасць, няўлоўнасць і сілу. З Шайтан-гары зручна назіраць, як унізе б'ецца гарачы пульс гарадскога жыцця, як працавітыя самазвалы мінскай маркі падвозяць бетон, цэмент, пясок і іншыя будаўнічыя матэрыялы да новага маста праз Прыпяць, які будуецца замест старога драўлянага.

Аднак не ўсім можна захапляцца ў Мазыры. Радасны настрой адразу сапсуецца, зробіцца сумным, калі заглянуць, напрыклад, у кнігарні горада. Іх у буйнейшым цэнтры беларускага Палесся дзве, ёсць яшчэ тры кіёскі Саюздруку.

Асноўным распаўсюджвальнікам беларускай кнігі ў Мазыры з'яўляецца магазін № 22 Гомельскага аблкнігагандлю. Ён займае непрыдатнае для такой мэты памяшканне. Размовы аб новым будынку для кнігарні, як паведаміў яе загадчык т. Шляга, вядуцца ўжо некалькі год, але ў хуткім часе на іншае памяшканне разлічваць не прыходзіцца.

У магазіна № 22 няма таксама добрага склада. Цяперашні склад знаходзіцца ў сырым поўпадвале, зноў-жа недастаткова прасторным. Кніжкі тут псуюцца ад залішняй вільгаці. Значную шкоду прыносяць ім грызуны.

І ўсё-ж галоўная бяда, бадай, не ў гэтым, а ў надзвычай нізкай культуры кніжнага гандлю.

Марозным студзеньскім днём заходзім у магазін № 22. Каля печы, што стаіць налева ад уваходу, тупае пралаўшчыца т. Жогла. Яна падкладае ў печ дровы, стукае нагой аб нагу, пацірае рукі, словам, як можа, ратуецца ад холаду.

— Што ў вас ёсць з твораў беларускіх паэтаў?

— Зараз няма нічога, — неяк абыякава адказвае прадаўшчыца і ідзе за прылавак.

Здзіўленыя, пачынаем уважліва прыглядацца да невялічкай бруднай вітрыны, да пакрытых пылам паліц. І вось заўважаем асобнае выданне купалаўскай паэмы «Над ракой Арэсай», зборнік вершаў для дзяцей Я. Коласа «Міхасёвы прыгоды», «Граніцу» А. Куляшова, «Цвёрдымі крокамі» П. Броўкі, «Шырокі свет» П. Панчанкі, «Выбраныя вершы» Ул. Хадыкі, творы А. Бялевіча, М. Засіма і іншых паэтаў.

Праўда, асабліва доўга любавацца кніжкамі нам не давялося. Хоць да абедзенага перапынку было яшчэ далёка, прадаўшчыца прапанавала пакінуць магазін. Ёй патрэбна было некуды пайсці. Дарэчы, так робіцца ва ўсіх кіёсках, якія часта па невядомай прычыне бываюць зачынены на замок.

Чакаем, потым зноў вяртаемся ў кнігарню, даведваемся, што пад прылаўкам ляжыць каля 80 назваў кніг беларускіх аўтараў: творы Ф. Багушэвіча і Цёткі, Я. Маўра і А. Якімовіча, П. Глебкі і М. Танка, В. Таўлая і М. Лужаніна, Б. Кірэенкі і М. Калачынскага і яшчэ многіх іншых беларускіх пісьменнікаў, крытыкаў і літаратуразнаўцаў.

Усе гэтыя кнігі не выстаўлены ні на вітрыну, ні на паліцы. Работнікі магазіна не ведаюць, што ў іх ёсць. Пакупнікі прасілі зборнік п'ес Я. Коласа, выдадзены ў 1955 годзе. Ім адмовілі. Загадчык пацвердзіў, што кніжкі няма не толькі ў магазіне, але і на складзе. А тым часам дзесяткі яе экземпляраў пыляцца пад прылаўкам.

Даходзіць да абуральнага. Прадаўцы кнігарні кладуць пад прылавак і зусім забываюцца нават на літаратуру, атрыманую па спецыяльнаму заказу пакупнікоў, якія з такой прычыны ходзяць па многа разоў па патрэбную кніжку і не могуць атрымаць яе. Так было, напрыклад, з брашурай В. Івашына «Рэволюцыя 1905—1907 г.г. і развіццё беларускай літаратуры» і некаторымі іншымі выданнямі.

Яшчэ часцей падобныя заказы, няхай сабе і на недэфіцытную літаратуру, проста не выконваюцца. Як бачна, попыт на кнігі не ўлічваецца, не вывучаецца, а без гэтага-ж нельга сапраўды культурна гандляваць, нельга паспяхова распаўсюджваць друкаванае слова.

Ды што гаварыць аб культуры гандлю, калі не зроблена самае элементарнае. У кнігарні няма і ніколі не было прасцейшай картатэкі, дзе-б можна было паглядзець, што ёсць сёння ў продажу. Кніжкі не сістаматызаваны, не ўпарадкаваны. Яны нагрувашчаны абы-дзе і абы-як.

Нейкае падабенства аддзелаў тэхнічнай, сельскагаспадарчай, палітычнай і мастацкай літаратуры, вядома, ёсць. Але ў аддзеле мастацкай літаратуры, сярод вершаў, паэм ляжаць чамусьці падручнік па венерычных хваробах, кніжка выбраных твораў прафесара-дарвініста П. Куляшова; у сельскагаспадарчы аддзел трапілі творы Эльзы Трыале, даследаванне В. Ермілава аб Гогалю, зборнік вершаў кітайскіх паэтаў, а сярод палітычнай літаратуры знаходзіцца музычная апрацоўка «Ой, пайду, пайду» і г. д.

Навесці парадак, ліквідаваць гэтую неразбярыху не вельмі ўжо і цяжка, асабліва калі ўлічыць, што новыя кнігі ў магазін паступаюць рэдка, адзін, калі-ні-калі два разы ў месяц.

Такая-ж блытаніна на складзе. Там таксама няма спісаў наяўнай літаратуры, таксама згрувашчаны кніжкі без усякай сістэмы. Некаторыя з іх своечасова не завозяцца ў кнігарню. Напрыклад, другі і наступныя тамы збору твораў Я. Купалы доўга пакрываліся цвіллю ў сутарэннях склада, а бібліятэка Мазырскага педінстытута выпісвала іх з Мінска, дарэмна пераплочваючы лішнія грошы. З Мінска выпісваліся зборнік вершаў Я. Лучыны, асобныя тамы збору твораў З. Бядулі, кнігі большасці нашых крытыкаў, хоць уся гэтая літаратура ляжала на складзе ці пад прылаўкам у магазіне.

Некалькі разоў педінстытут даваў заказ у розныя мінскія кнігарні на «Беларускую літаратуру XIX стагоддзя» (зборнік тэкстаў, выдадзены Акадэміяй навук БССР у 1950 годзе). Але ў Мінску кніжка даўно разыйшлася, і мазырскія студэнты вывучалі многія праграмныя матэрыялы па адзінаму, да таго-ж з друкарскім бракам, экземпляру Цэнтральнай гарадской бібліятэкі. А між тым гэты зборнік спакойна ляжыць на базе былога Палескага аблкнігагандлю на станцыі Мазыр. Тут-жа набіраюцца вільгаці або пакрываюцца пылам асобнае выданне паэм Я. Коласа «Новая зямля» і «Сымон-музыка», трэці том збору твораў З. Бядулі, «Выбраныя творы» М. Лынькова, «Комуністы» А. Куляшова і іншыя беларускія і рускія кніжкі, якіх няма ў Мазыры. Такі-ж лёс напаткаў і многія падпісныя выданні, у тым ліку тамы Міцкевіча і Пушкіна, Л. Талстога і К. Федзіна.

Новыя кнігі ўжо некалькі год не паступаюць на базу, старыя-ж нікуды не накіроўваюцца, ляжаць без руху. Аднак база існуе. Цяпер яна падпарадкоўваецца Гомельскаму аблкнігагандлю і мае свайго загадчыка т. Кашкова, які займаецца ў асноўным спісваннем устаралых падручнікаў.

Так ствараецца легенда, што кніжка «не ідзе». Дык як-жа яна можа трапіць да чытача, калі яе трымаюць пад замком, калі ёю не ўмеюць гандляваць?!

Дайце кніжцы свабоду, пакажыце яе пакупніку, і яна разыйдзецца, як разыйшліся ў Мазыры за адзін дзень больш за сотню экземпляраў «Нарысаў па гісторыі беларускай літаратуры» і больш 50 экземпляраў зборніка «Беларускія пісьменнікі другой паловы XIX стагоддзя».

Зразумела, кніжка будзе ляжаць, калі прыходзяць людзі і просяць вершы П. Труса, а работнікі аднаго магазіна адзіўлена паціскаюць плячыма, а ў другім не ведаюць, што ёсць такі паэт.

Прадаўшчыца кіёска № 1 т. Фурман у якасці кніжак беларускіх аўтараў прапанавала нам перакладзеныя на беларускую мову творы М. Жулаўскага, С. Шчыпачова, Н. Носава, А. Конанава, Л. Нікуліна, Ус. Кочэтава (!?) і асабліва доўга настойвала, што І. Вазаў, відаць, усё-ж такі беларус, бо, маўляў, нідзе не сказана, што яго раман «У ярме» — пераклад. Прышлося звяртацца да прадмовы.

Вядома, ніводнай кніжкі нашага пісьменніка ў перакладзе на рускую мову не было прапанавана. Выключэнне не зроблена нават свайму пісьменніку-земляку Усеваладу Краўчанку, які нарадзіўся на Мазыршчыне ў вёсцы Міхалкі.

Пагарда да беларускай літаратуры, нежаданне папулярызаваць яе выяўлялася ў рэпліках гэтай прадаўшчыцы.

Пасля рэплік прадаўшчыцы перастаеш здзіўляцца, што беларускія кніжкі пазапіханы ў самыя цёмныя куткі, адкуль іх дастаюць не з дапамогай лесвіцы, якой у кіёску няма, а паклаўшы адзін на другі некалькі кніжных пакаў.

Не ведае і не любіць сваёй справы прадаўшчыца суседняга кіёска № 2 т. Баробкіна.

— Не ведаю, што ў мяне ёсць з беларускіх пісьменнікаў, — прызнаецца прадаўшчыца.

— А вы паглядзіце...

Нехаця, пасля працяглай спрачкі яна падае некалькі кніжак. У нашай прысутнасці адбываецца наступная размова:

— Дайце што-небудзь дзіцячае.

— Што я вам дам, нічога няма,—абыякава адказвае прадаўшчыца.

Пакупнік нейкі час гаруе, што без кніжкі няўручна вяртацца дамоў, сын будзе засмучаны, а потым узрадавана гаворыць. «А вунь «Бярозка», дайце яе», — і задаволены адыходзіць.

Трохі прыемней у апошні час стаў выглядаць трэці кіёск (на цэнтральнай плошчы), дзе з верасня мінулага года працуе тав. Лазюк. Тут на відных месцах выстаўлены беларускія і рускія кніжкі, рознастайныя часопісы, можна атрымаць дакладную даведку аб патрэбнай мастацкай літаратуры, аб перыядычных выданнях і г. д. Але зноў бяда: дах працякае, падлога закапта сырая, таму псуюцца плакаты, газеты, рэпрадукцыі з карцін, а гарадское аддзяленне Саюздруку (загадчык тав. Карась) нічога не можа ці не жадае зрабіць.

Такія факты. Яны сведчаць, што ў Мазыры кніжны гандаль даверaны ў большасці выпадкаў непадрыхтаваным або абыякавым людзям, якія не ведаюць кнігі, а то і не хочуць ведаць яе. Хіба можна пры такім стане рэчаў гаварыць пра рознастайныя формы прапаганды кнігі, калі не любяць і не чытаюць беларускай літаратуры, разгляд